Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 СНЕЖНЯ 2017 г. СУБОТА №243 (28607)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дзе вытокі нашай дзяржаўнасці?

СТАР. 5

Айчыннаму кіно — 93 гады

СТАР. 8

Як палітыка ўплывае на спорт?

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АРЛОЎСКІ, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:

«З 1 студзеня 2018 года ў шэрагу выпадкаў рашэнні аб рэгістрацыі дэкларацыі на тавары, сама рэгістрацыя, а таксама рашэнні аб выпуску тавараў могуць прымацца інфармацыйнымі сістэмамі аўтаматычна, без удзелу інспектара. Аўтаматычны выпуск тавараў, замацаваны ў Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза, першай на тэрыторыі ЕАЭС укараніла менавіта беларуская мытня».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.12.2017 г.

Долар ЗША		2,0257 ▼
Еўра		2,3882 ▼
Рас. руб.		0,0344 ▼
Укр. грыўня		0,0732 ▼

ISSN 1990 - 763X

Першая пасля Скарынавай

Фота БЕЛТА.

Учора ў Брэсце да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ўстанавілі памятны знак Брэсцкай Бібліі. Брэсцкая друкарня, заснаваная Мікалаем Радзівілам Чорным у 1553 годзе, была першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі, як і выдадзеная ў ёй праз дзесяць гадоў Бібліі.

■ Перспектыва

«ЭЛЕКТРАЖЫЛЛЁ» ЎЖО НЕ ФАНТАСТЫКА

Адраснае субсідаванне налета будзе сканцэнтравана на шматдзетных сем'ях

Фота БЕЛТА.

У гэтай пяцігодцы запланаваны ўвод у эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі і, адпаведна, выпрацоўкі электрычнай энергіі. У сувязі з гэтым ужо з 2017 года пачалося праектаванне новых жылых дамоў для будаўніцтва іх з 2018 года з разліку прымянення электрычнасці не толькі для гатавання ежы, але і для абаграванне і атрымання гарачай вады. Аб блізкіх перспектывах будаўніцтва жылля ў нашай краіне «Звяздзе» расказаў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.

СТАР. 4

■ Сітуацыя

ДОМ НА СЯМІ ВЯТРАХ...

Ініцыятыўны мінчанін спрабуе навесці парадак у шматпавярхоўцы

Як часта мы, стаміўшыся на працы ці пагрузіўшыся ва ўласныя праблемы, не звяртаем увагі на бытавыя недахопы. Перагарэла лямпачка ў пад'ездзе — пачакаем, пакуль пытанне вырашыць хто-небудзь з суседзяў, непрыемны пах — па лесвіцы можна ісці і трохі хутчэй. І такія хібы пачынаюць назапашвацца як снежны ком, пакуль за домам трывала не замацоўваецца слава «праблемнага».

«Незабыўны» пах

Аднак з такой сітуацыяй мірыцца гатовыя не ўсё. Колькасць зваротаў да камунальных службаў з нагоды дома па адрасе Убарэвіча, 38, корпус 2 рэзка вырасла пасля таго, як у верасні гэтага года кватэру ў ім набыў Сяргей Гаркоўскі. Гісторыя пачыналася добра: яшчэ гадоў 10 таму мужчына здымаў тут кватэру, умовы яму вельмі падабаліся, да таго ж ён заўсёды хацеў жыць на першым паверсе, так што пры куплі «сышліся зоркі». Аднак радасць набыцця жылля вельмі хутка азмрочыла з'яўленне ўстойлівага непрыемнага паху, які ахутаў усю кватэру. На пытанні Сяргея мясцовыя жыхары толькі разводзілі рукамі: гэта яшчэ кветачкі, вось летам...

Аказалася, што ў доме з перыядычнасцю мінімум раз у тыдзень забіваецца каналізацыя, у сувязі з чым спецыфічнае «амбрэ» ў літаральным сэнсе слова атакуе жыхароў першага паверха. Сяргей прывыкаць да гэтага быў не гатовы, таму пачалося яго «хаджэнне па пакутах», а дакладней, эпапея са зваротамі ў розныя інстанцыі.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У першых нумарах 2018-га — календары: насценны, рэлігійны і народны

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

АСАБЛІВАЯ СЛУЖБА

Кіраўнік дзяржавы прыняў удзел у святкаванні 100-годдзя органаў дзяржаўнай бяспекі

Гісторыя прадвызначыла нашай краіне заўсёды знаходзіцца ў цэнтры падзей еўрапейскага і нават сусветнага маштабу. Як падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас свайго выступлення на юбілейных урачыстасцях, у такіх няпростых умовах станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці было б немагчыма без эфектыўнай работы сілавых структур і, безумоўна, спецыяльных службаў. Сваю ролю яны сыгралі як у савецкія часы, так і ў 90-я гады. Ды і зараз іх работа — барацьба з тэрарызмам, незаконным гандлем зброяй, карупцыяй — асабліва значная.

— Разведка і контрразведка ва ўсе часы былі першаступеннымі дзяржаўнымі задачамі. У авангардзе армій, што змагаюцца, у стане праціўніка сакрэтныя агенты здабывалі найкаштоўнейшыя звесткі, выяўлялі шпіёнаў, дыверсантаў, тэрарыстаў, здраднікаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да супрацоўнікаў службы дзяржаўнай бяспекі.

Яны выканалі сваю функцыю ў асабліва драматычнае XX стагоддзе. Гэта і Грамадзянская вайна, і першыя гады існавання дзяржавы рабочых і сялян, і Другая сусветная вайна, і гады халоднай вайны, і ліквідацыя наступстваў чарнобыльскай катастрофы. З атрыманнем Беларуссю незалежнасці супрацоўнікі службы дзяржаўнай бяспекі адкрылі чарговы раздзел у сваім славутым летапісе.

— Сёння перад нашымі спецслужбамі стаяць новыя задачы. Адна з іх, галоўная, — барацьба з тэрарызмам. Свет нагадвае разварушаны мурашнік. Цераз межы перапраўляюцца натоўпы бежанцаў, а пад іх прыкрыццём — фанатыкі, якія забіваюць мірных грамадзян, сеюць хаос. У транзітным патоку на тэрыторыі нашай рэспублікі рэгулярна затрымліваюцца члены міжнародных тэрарыстычных арганізацый, — канстатаваў кіраўнік краіны.

Ідзе і незаконны гандаль зброяй.

— На жаль, ад гэтага не застрахаваны і мы, — сказаў Прэзідэнт. — Нам неабходна быць максімальна пільнымі і ні ў якім разе не дапусціць, каб гэты арсенал стаў пранікаць цераз нашу мяжу.

Другая важная задача, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, датычыцца эканамічнага сектара. Усе навуковыя сакрэты, навейшыя тэхналагічныя распрацоўкі, стратэгічныя аб'екты, такія як Беларуская атамная электрастанцыя, хімічныя прадпрыемствы, павінны стаць прадметам пільнай увагі органаў дзяржбяспекі.

— Неабходна працягнуць актыўную барацьбу з карупцыяй, рознымі схемамі сыходу гаспадарчых суб'ектаў ад падаткаў, вывадам грашовых сродкаў за мяжу, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Вопыту ў гэтай справе Камітэту не займаць. Напрыклад, падчас адной з нядаўніх аперацый яму ўдалося спыніць атрыманне найбуйнейшай у гісторыі краіны сумы хабару на пяць мільёнаў долараў. Прычым усе гэтыя грошы былі арыштаваныя і вернутыя ў бюджэт.

Прэзідэнт адзначыў, што ў апошнія гады агульнымі намаганнямі кампетэнтных службаў атрымалася ўзяць кантроль над карупцыяй — і гэта прызнаюць усе ў свеце. Тым не менш гэтая праблема, як і ценявая камерцыя, па-ранейшаму актуальная для краіны.

— Найважнейшую ролю ў супрацьстаянні гэтаму злу іграюць органы дзяржбяспекі. Неабходна адзначыць, што многія сучасныя пагрозы могуць быць пераадоленыя толькі разам. КДБ Беларусі развівае практычнае ўзаемадзеянне са службамі дзясяткаў краін, перш за ўсё з Расіяй і нашымі постсавецкімі рэспублікамі. Высокі ўзровень партнёрства дазваляе паспяхова праводзіць сумесныя мерапрыемствы. На падставе інфармацыі нашых работнікаў спынены шэраг спроб здзяйснення тэрактаў у Расіі і некаторых еўрапейскіх дзяржавах, — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Прэзідэнт канстатаваў, што Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі адбыўся як эфектыўная і самадастатковая спецслужба суверэннай краіны — гэты факт прызнаны і нашымі сябрамі, і нашымі апанентамі. У многім дзякуючы прафесіяналізму спецслужбаў у смутныя гады пасля развалу Савецкага Саюза дзяржаве ўдалося накіраваць сітуацыю ў спакойнае русла і заняцца гаспадарчымі пытаннямі. У выніку Беларусь стала сапраўды незалежнай дзяржавай.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Гэта абмяркоўвалі на з'ездзе вучоных

ДЗВЕ ДЗЯРЖАЎНЫЯ МОВЫ: ЯК ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАРЫТЭТ

«25-гадовы досвед будаўніцтва незалежнай дзяржавы ставіць на парадак дня праблему неадкладнай гарманізацыі сферы моўнага жыцця беларускага грамадства ў адпаведнасці з сутнасцю і прынцыпамі дзяржаўнага двухмоўя», — такую думку выказаў у сваім выступленні на II З'ездзе вучоных у рамках секцыі «Гуманітарыстыка — грамадству» першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай мовы, культуры і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.

— Праблемы гуманітарнага развіцця грамадства разумеюць на дзяржаўным узроўні, — падкрэсліў выступоўца. — Трэба адзначыць, што сфера моўнага развіцця беларускага грамадства — вельмі складаная, таму што мы ўсе жывём у сітуацыі дзяржаўнага двухмоўя. Сутнасць дзяржаўнага двухмоўя павінна заключацца ў паралельным, парытэтным і раўнапраўным выкарыстанні абедзвюх дзяржаўных моў ва ўсіх найважнейшых сферах афіцыйных зносін. Па-першае, павінна забяспечвацца права кожнага грамадзяніна карыстацца ў сваёй дзейнасці любой дзяржаўнай мовай і атрымліваць усю неабходную інфармацыю на кожнай з дзяржаўных моў, а па-другое, дзяржава абавязана праз свае інстытуты і сваіх служачых забяспечыць кожнаму грамадзяніну гэтае права.

Ёсць цэлы комплекс абавязковых умоў, выкананне якіх забяспечвае парытэтнае функцыянаванне абедзвюх дзяржаўных моў ва ўсіх сферах іх ужытку. І для таго каб функцыянаванне насамрэч было парытэтным, неабходна каб гэтыя ўмовы рэальна выконваліся. На думку акадэміка, на сённяшні дзень найбольш актуальнымі з'яўляюцца адукацыйныя ўмовы. Бо толькі шляхам навучання можна забяспечыць адпаведны ўзровень валодання абедзвюма дзяржаўнымі мовамі.

Акадэмік упэўнены, што дастатковая моўная кампетэнцыя неабходная службовым асобам усіх узроўняў, якія павінны забяспечыць кожнаму грамадзяніну права выкарыстоўваць любую мову. «Я казаў пра гэта 10 гадоў назад, на першым з'ездзе вучоных, і паўтару зноў — неабходна, каб дасканалае валоданне службовымі асобамі абедзвюма дзяржаўнымі мовамі (беларускай і рускай) нарэшце стала абавязковым патрабаваннем прафесійнай адпаведнасці пасадзе».

Агучыў Аляксандр Лукашанец і неадкладныя задачы па гарманізацыі моўнай сферы жыцця нашага грамадства. Па-першае, трэба прывесці моўнае заканадаўства ў адпаведнасць з прынцыпамі дзяржаўнага двухмоўя, а для гэтага неабходна ўнесці адпаведныя змяненні ў Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» — у адпаведных артыкулах закона выразы «на беларускай або рускай мовах», «на беларускай і (або) рускай мовах» паслядоўна замяніць выразам «на беларускай і рускай мовах». Па-другое, падрыхтоўка, абмеркаванне і прыняцце ўсіх законаў, указаў, пастаноў і іншых заканадаўчых актаў павінна праходзіць на абедзвюх дзяржаўных мовах.

— У вышэйшай школе, асабліва пры падрыхтоўцы педагагічных кадраў, трэба забяспечыць атрыманне ўсімі выпускнікамі належнай моўнай кампетэнцыі, каб кожны малады педагог мог выкладаць свой вучэбны прадмет на любой мове. Акрамя таго, пры заканчэнні агульнаадукацыйных устаноў і паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы цэнтралізаванае тэсціраванне павінна праводзіцца для абітурыентаў па абедзвюх дзяржаўных мовах, — дадаў Аляксандр Лукашанец. — Я ўпэўнены, што выкананне гэтых мер дазволіць забяспечыць захаванне прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў нашай краіне і рэалізаваць на практыцы права грамадзян атрымліваць інфармацыю на любой дзяржаўнай мове ў двухмоўным грамадстве. Да таго ж у нас з'явіцца магчымасць атрымання адукацыі на любой дзяржаўнай мове. Мы зможам забяспечыць псіхалагічны камфорт усім грамадзянам у двухмоўным грамадстве і ўмацуем прэстыж Беларусі як прававой дэмакратычнай дзяржавы, якая паважае свае каштоўнасці і інтэгруецца ў еўрапейскую і сусветную супольнасць.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

Разбор «палётаў»

Кампетэнтна аб хуткасці руху і наяўнасці правоў

Пазаўчора беларускія дэпутаты прынялі ў другім чытанні папраўкі ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП) і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Аднак некаторыя СМІ не зусім дакладна інтэрпрэтавалі змены, у сувязі з чым з'явілася неабходнасць выразнага тлумачэння.

Згодна з дзеючымі нормамі артыкула 18.13 КаАП, перавышэнне ўстаноўленай хуткасці руху ад 10 да 20 кіламетраў у гадзіну прыводзіць да папярэджання або штрафу ў памеры да адной базавай велічыні. Калі перавышэнне ад 20 да 30 кіламетраў у гадзіну, то кіроўца атрымлівае штраф у памеры ад адной да трох базавых. Перавышэнне на 30 і больш — штраф ад трох да дзесяці базавых. Калі апошнія два апісаныя парушэнні паўтараюцца на працягу года, то кіроўца атрымае штраф ад пяці да 15 базавых або пазбаўленне правоў да аднаго года.

Першапачаткова планавалася выключыць з санкцый указанага артыкула пазбаўленне правоў, аднак пасля дыскусій у Палаце прадстаўнікоў з удзелам шырокага кола экспертаў было вырашана захаваць дзеючую рэдакцыю ўказанага артыкула. Акрамя таго, як і раней, такая санкцыя не можа быць прыменена пры фіксацыі хуткасці спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі.

Дарэчы, калі спецыяльная камера фіксуе перавышэнне хуткасці ад 10 да 20 кіламетраў у гадзіну, то кіроўца атрымлівае штраф у памеры 0,5 базавай велічыні. Калі камера фіксуе перавышэнне ад 20 да 30 кіламетраў — гэта штраф у памеры дзвюх базавых, ад 30 да 40 кіламетраў — штраф у памеры 4 базавых. Калі ж перавышэнне складае больш за 40 кіламетраў у гадзіну — штраф у памеры шасці базавых велічынь.

Акрамя таго, па прапанове Міністэрства ўнутраных спраў з КаАП выключаецца артыкул 18.18, якім прадугледжана да дзвюх базавых велічынь за кіраванне аўтамабілем без дакументаў, неабходных па правілах дарожнага руху. Чаму? Пры сучасным тэхнічным забеспячэнні супрацоўнік ДАІ можа аператыўна на месцы высветліць, мае ці не мае кіроўца права кіравання ці не. Калі не мае, то гэта сур'ёзнае парушэнне, за якое прадугледжана строгая адказнасць па іншай норме. Калі ж кіроўца проста забыўся дома дакумент, то прымяненне штрафу — гэта занадта жорсткае пакаранне, палічылі дэпутаты.

Калі ў кіроўцы няма правоў наогул, то дзейнічае артыкул 18.19, згодна з якім кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае правоў кіравання, роўна як і перадача кіравання транспартным сродкам асобе, якая не мае правоў, прыводзіць да накладання штрафу ў памеры ад пяці да дваццаці базавых велічынь.

Калі тыя ж дзеянні ажыццяўляюцца паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за тыя ж парушэнні, то гэта прывядзе да накладання штрафу ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь або адміністрацыйнага арышту.

Увядзенне адміністрацыйнага арышту ў артыкуле 18.19 — гэта навіна. Чаму гэта з'явілася? У 2016 годзе па віне вадзіцеляў, якія не мелі права кіравання, было здзейснена 267 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі 49 і атрымалі раненні 284 чалавекі. Нягледзячы на зніжэнне выпадкаў такіх здарэнняў, іх доля ў агульнай колькасці ў сярэднім складае 7—10% ад усіх учыненых па Беларусі ДТЗ.

Значная частка такіх здарэнняў здзяйсняецца асобамі, пазбаўленымі ва ўстаноўленым парадку такога права за правапарушэнні ў галіне бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту. Найбольш частым з іх з'яўляецца кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення.

У 2016 годзе да адміністрацыйнай адказнасці за кіраванне транспартнымі сродкамі кіроўцамі, якія не маюць на гэта права, прыцягнута звыш 59 тысяч чалавек. Пры гэтым паўторна на працягу года за ўчыненне такога правапарушэння — звыш 14 тысяч. Колькасць асоб, якія тройчы і больш разоў прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за гэтае правапарушэнне, склала практычна 1,7 тысячы.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

■

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Трамп і Пуцін абмеркавалі ядзерную праграму КНДР

Прэзідэнты Расіі і ЗША па тэлефоне абмеркавалі становішча на Карэйскім паўвостраве, паведамляе прэс-служба Крамля. Адзначаецца, што размова адбылася па ініцыятыве амерыканскага боку.

«Былі абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковых адносін, а таксама сітуацыя ў крызісных пунктах з акцэнтам на ўрэгуляванне ядзернай праблемы Карэйскага паўвострава», — гаворыцца ў паведамленні.

У сваю чаргу ў прэс-службе Белага дома заявілі аб тым, што прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падчас тэлефоннай размовы з Уладзімірам Пуціным падзякаваў яму за прызнанне высокіх эканамічных паказчыкаў, якіх дабіліся амерыканскія ўлады.

Падчас сваёй штогадовай прэс-канферэнцыі 14 снежня Пуцін заклікаў і ЗША, і КНДР спыніць нагнятанне сітуацыі. Ён таксама падтрымаў гатоўнасць Вашынгтона да прамых кантактаў з Пхеньянам.

У Расіі прызначана дата выбараў прэзідэнта

Савет Федэрацыі аб'явіў аб прызначэнні выбараў прэзідэнта Расіі на 18 сакавіка 2018 года. Выбары ў 2018 годзе павінны былі адбыцца 11 сакавіка — у другую нядзелю месяца. Але за год да гэтага Дзярждума прапанавала перанесці галасаванне на тыдзень, каб яно супала з гадавінай падпісання дамовы аб уваходжанні Крыма ў склад Расіі.

Пра свой намер удзельнічаць у выбарах ужо аб'явіў дзеючы прэзідэнт Уладзімір Пуцін. Вылучыцца таксама плануе Генадзь Зюганаў (КПРФ), Уладзімір Жырыноўскі (ЛДПР), Рыгор Яўлінскі («Яблоко»), упаўнаважаны па абароне правоў прадпрымальнікаў Барыс Цітоў і журналістка Ксенія Сабчак.

Апазіцыянер Аляксей Навальны з 2016 года вядзе перадвыбарную кампанію па вылучэнні ў прэзідэнты. Пры гэтым у 2017 годзе Навальнага паўторна асудзілі па артыкуле, што па законе забараняе яму вылучацца. Навальны лічыць такую норму неканстытуцыйнай.

Меркель: прагрэс, дастатковы для адмены санкцый супраць РФ, пакуль не атрымаўся

На думку канцлера ФРГ, трэба зрабіць усё, каб рухацца наперад на шляху рэалізацыі мінскіх пагадненняў. Краіны ЕС вывучылі вынікі работы нармандскага фармату і прыйшлі да высновы, што пакуль прагрэсу, якога павінна было б хапіць для адмены санкцый супраць Расіі, дамагчыся не ўдалося.

«Па гэтым пытанні было адзінства ў меркаваннях, — сказала Ангела Меркель. — Мы вывучылі вынікі работы нармандскага фармату, мінскага працэсу. Мы змаглі пазбегнуць эскалацыі, але не змаглі дамагчыся значнага поспеху для адмены санкцый, таму яны павінны быць прадоўжаны».

■ Ад шчырага сэрца

УСЕ НА ЛЁД!

Святочным мерапрыемствам у Лядовым палацы пачаўся ў сталіцы дабрачынны марафон Беларускага дзіцячага фонду

27-Ю РЭСПУБЛІКАНСКУЮ дабрачынную акцыю «Нашы сэрцы — дзецям», якая праходзіць у межах агульнарэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», падтрымалі сёлета дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву па фігурным катанні на каньках і валанцёрскі клуб Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «СЛОН».

Свята для дзяцей-сірот, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, праходзіла на каньках. На лёд выйшаў і сам Дзед Мароз. Забаўляльная праграма прадугледжвала конкурсы і гульні, выступленні выхаванцаў школы алімпійскага рэзерву па фігурным катанні, навагодняе лядовае прадстаўленне, майстар-класы ад юных фігурыстаў і трэнераў, масавае катанне для ўсіх гасцей. Завяршылася ўсё ўручэннем навагодніх падарункаў.

22 снежня дзіцячы фонд плануе падарыць навагодняе свята пацыентам дзіцячага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя, 26 снежня — дзіцячага апёкавага аддзялення Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, 27 снежня — дзіцячага траўматалагічнага аддзялення 6-й гарадской клінічнай бальніцы, 28 снежня — Рэспубліканскага дзіцячага кардыялагічнага цэнтра. Акцыя «Нашы сэрцы — дзецям» пройдзе ва ўсіх рэгіёнах.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

(Больш фота — на сайце «Звязды».)

■

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

Клаўдзія ЛІТВІНЧУК, настаўніца-пенсіянерка з вёскі Тэльмы Кобрынскага раёна:

Калі пачытала, дык і палюбіла

— Газету пачала чытаць маладой настаўніцай. Сёлета наш выпуск адзначыў 50-годдзе з дня заканчэння інстытута, значыць, і выпісваю я выданне больш за 40 гадоў. А зрабіць выбар на карысць газеты на роднай мове дапамог выпадак. Ведаеце, як бывае ў вясковай школе, калі не хапае спецыялістаў: любы настаўнік і швец, і жнец, і на дудзе ігрэц. Так і мне, географу і біёлагу, аднойчы давялося выкладаць родную мову і літаратуру ў чацвёртым класе. Ну і выпісала тады беларускую газету, каб больш практыкавацца. А калі пачытала, дык і палюбіла. Як аказалася, назаўсёды.

У маладосці, у студэнцкія гады, мне пашчасціла шмат вандраваць па Савецкім Саюзе, аб'ехала таксама ўсю Беларусь. Таму люблю матэрыялы краязнаўчага характару. Вось нядаўна прачытала, што адкрыўся для наведвальнікаў Косаўскі палац. З дачкой пагаварылі, прыйшлі да высновы, што летам добра было б з'ездзіць... Чытаю наогул усё. Асабліва люблю аўтарскія калонкі. З цікавасцю прачытваю ўсё, што датычыцца Брэсцкага рэгіёна. Удзячная за тое, што і з нашай вёскі ў апошні час на старонках было некалькі матэрыялаў. Мы іх чытаем разам з сяброўкамі-суседкамі, захоўваем выразкі.

Дзякуй за тое, што газета шмат піша пра людзей, што даязджаеце ў самыя аддаленыя вёскі. Жадаю, каб і другое стагоддзе любімая газета заставалася такой жа людскай і цікавай.

■ Будзе свята!

На кірмашы — па водар хвоі

Праўда, на навагоднія святы ўсё часцей замест лясного дрэўца сталі выбіраць штучныя ялінкі.

— З 2015 года аб'ёмы продажу натуральных елак памяншаюцца, у 2016 годзе іх удалося рэалізаваць каля 140 тысяч. Акрамя звыклых ссечаных дрэў карыстаюцца папулярнасцю букеты з галінак і жывыя расліны ў кадках. Так, за 2015 год грамадзяне набылі каля 600 жывых елак, а ў 2016 годзе гэтая лічба павялічылася да 900, — паведаміў **начальнік упраўлення вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр СУРТА.**

Сёлета да рэалізацыі падрыхтавана каля 180 тысяч навагодніх дрэў, яны трапяць у продаж з 22 снежня. Магчыма, што ў некаторых абласных гарадах гандаль пачнецца нават раней — асобныя арганізацыі, юрыдычныя асобы ўжо зацікаўленыя, каб набыць ялінку да свята раней. Усяго па краіне запланавана 1100—1150 гандлёвых пунктаў, прычым па 20—25 з іх з'явяцца ў абласных гарадах.

Аляксандр УГРЫН, кансультант упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі, папярэдзіў пра ўзмоцнены рэжым аховы лясоў, які дзяржаўная лясная ахова распачне з 18 снежня. У спецыяльных рэйдах прымуць удзел супрацоўнікі МУС, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншыя зацікаўленыя ўстановы. Таксама лясная ахова выставіць на дарогах агульнага карыстання пасты, якія стануць правяраць наяўнасць дакументаў на дазвол правозу навагодніх дрэў. Акрамя таго, у сістэме адсочвання сёння выкарыстоўваецца 526 фотапастак, з пачатку года з іх дапамогай да адказнасці былі прыцягнуты 283 парушальнікі.

— Хацелася б адзначыць, што, у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконную высечку дрэў прадугледжваецца адказнасць у выглядзе штрафу ад 5 да 50 базавых велічынь, — нагадаў Аляксандр Угрын.

Дарэчы, кошт ялінкі вышынёй ад 1 да 2 метраў сёлета вагаецца на ўзроўні 9—15 рублёў у залежнасці ад вышыні дрэўца і рэгіёна яго рэалізацыі. Як і заўсёды, танней набыць навагоднее дрэва можна будзе адразу ў лясніцтве.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

■

■ Будзь у курсе!

Вакзал для... аркестра

Адбудзецца ён 20 снежня. Сумесны музычны праект БЧ і Прэзідэнцкага аркестра пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі Віктара Бабарыкіна правядзіцца на вакзале станцыі Мінск-Пасажырскі ўпершыню і прымеркаваны да 155-годдзя Беларускай чыгункі, расказалі ў прэс-службе магістралі.

На працягу гадзіны, з 12.40 да 13.40, у зале чакання на трэцім паверсе вакзала пасажыры, госці і жыхары сталіцы адправяцца ў музычнае падарожжа з удзелам таленавітых музыкантаў Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь — будуць гучаць сусветныя хіты і нацыянальныя мелодыі розных краін. Сімвалічна, што выступленне калектыву прахадзіць у год яго 15-годдзя.

Сярод гледачоў на канцэрце таксама будуць прысутнічаць актывісты БРСМ, работнікі і ветэраны беларускай магістралі.

20 снежня на канцэрце запланавана ўшанаванне двухмільённага інтэрнэт-пасажыра, якому будуць уручаныя памятны падарунак і імянны сертыфікат, які пацвярджае гэты статус.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

■ Небяспека

Зімовы пералом

Толькі за адзін зімовы дзень — у мінулую нядзелю — з галалёднай траўмай у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі паступілі 18 чалавек, чацвёра з якіх — дзеці.

Галалёдная траўма сама па сабе бывае рознай. Пацярпець у выніку падзення на слізкі лёд могуць і рукі, і ногі, і пазваночнік, і галава, а ў пажылых — яшчэ і шыйка бядра. Менавіта таму ўрачы нагадваюць аб важнасці мер засцярогі і самакантролю, пра што многія ўспамінаюць толькі ў лячэбнай установе. Паводле слоў **галоўнага пазаштатнага дзіцячага траўматолага-артапеда камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, загадчыка дзіцячага траўматолага-артапедычнага аддзялення 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Станіслава ТРАЦЦЯКА**, пік траўмаў у дзяцей прыпадае на лета, калі тыя больш часу застаюцца без нагляду, аднак і зімой хапае нешчаслівых здарэнняў. Не так даўно адно катанне на санках скончылася няўдалым падзеннем таты на нагу дзіцяці. У выніку — пералом. Другое дзіця пацярпела ад таго, што ў той момант, калі яно ўпала, нехта наехаў яму на кісць. Адсюль аперацыя, ды не адна...

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Подразделение департамента: Управление по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Уполномоченный орган: отдел принудительного исполнения по Витебскому району г. Витебска.

Лот №1. Капитальное строение (одноквартирный жилой дом) с инв. №200/С-28344, общей площадью 46,6 кв. м с составными частями и принадлежностями: жилой пристройкой, сенями, уборной, расположенное на земельном участке с кадастровым номером №221280610101000737, площадью 0,2163 га, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, аг. Ольгово, ул. Южная, 31. Начальная цена: 5 965,20 рублей. Задаток: 596,52 рублей. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Дата, время и место проведения аукциона: 17.01.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 18.12.2017 с 8.30 по 16.01.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, копии учредительных документов, иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63.

Условие – наличие не менее 2 участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5% (Претендент на покупку). Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе предмета аукциона не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона изготавливает технический паспорт на объект за счет собственных средств. Организатор аукциона вправе снять лот с аукциона по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным. **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

В связи с утерей **считать недействительным** свидетельство о государственной регистрации Закрытого акционерного общества «ЭКСПОСИТИ».

УНП 691299833

■ Здарэнні

Кватэра загарэлася ад свечкі?

На пажары па вуліцы Галадзеда ў сталіцы выратавалі пяцярых дарослых і двух дзяцей.

Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца, па знешніх прыкметах нічога не назіралася. Высветлілася, што на другім паверсе пяціпавярховага жылога дома ў адной з кватэр загарэлася маёмасць у гасцінай і пакоі. Гаспадыні жылля на момант здарэння дома не было. Работнікі МНС з вышэйразмешчаных паверхаў выратавалі сем чалавек, сярод іх — двое дзяцей 2009 і 2015 гадоў нараджэння. З пад'езда эвакуіравалі яшчэ чатырох жыльцоў, у тым ліку дзіця. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, версія, якая разглядаецца: пакінутая гаспадыняй кватэры без нагляду запаленая свечка. У выніку здарэння агнём пашкоджана маёмасць. Пацярпелых не было.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

ДОМ НА СЯМІ ВЯТРАХ...

Той самы дом.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мужчына адразу абраў выразную тактыку: нікуды не тэлефанаваць, а пісаць афіцыйныя звароты ў двух экзэмплярах і рэгістраваць іх. Усё ж напісанага пяром не высечы сякерай. Пачалося ўсё са звароту ў ЖЭУ, потым на нумар 115, далей у ЖКГ Заводскага раёна. Тут мужчыну быццам бы выслухалі, каналізацыю прабілі, такое было і раней, аднак праз тыдзень сітуацыя паўтарылася зноў. Справа ў тым, што тры гады таму ў доме мянялі чыгунныя трубы на пластыкавыя, па ўсёй бачнасці, парушыўшы тэхналогію. А ў электрашчытавой не працуе выцяжка, з-за чаго пах «аператыўна» распаўсюджваецца па пад'ездзе. Да таго ж вакол збудавання не аднавілі адмостку, што прыводзіць да разбурэння падмурка. Так што неабходныя кардынальныя меры.

Аднак Сяргею паабяцалі — усё будзе зроблена. Час ішоў, а работы нават не пачыналіся... Не знайшоўшы падтрымкі ў ЖКГ, мужчына вырашыў звярнуцца ў санстанцыю, перад прыходам якой, зразумела, актывізаваліся камунальныя службы. У склеп у адпаведнасці з заканадаўствам падчас афіцыйнага агляду мужчыну не дапусцілі. А неўзабаве прыйшоў адказ: сур'ёзных парушэнняў няма, хіба што трэба прывезці свежага пяску. У той жа час жыхар сцвярджае, што ў падвале поўна смецця, пры гэтым памяшканне не праветрываецца, вокны — забітыя наглуха.

Наступнай прыступкай стаў запіс на прыём да кіраўніка адміністрацыі раёна Аляксандра Дараховіча. Балазе, за дзень да прызначанай даты мінчуку ўсё ж патэлефанаваў дырэктар ЖКГ Заводскага раёна Уладзімір Лебедзь — на прыём іх выклікалі разам. Гэтую папярэднюю сустрэчу па ініцыятыве Сяргея правялі не ва ўтульным кабінеце, а, як той казаў, у гарачай кропцы — каля дома, каб можна было не толькі расказаць аб праблемах, але і паказаць іх наглядна. Убачыўшы непрывабную карціну, дырэктар ЖКГ даў Сяргею асабісты нумар тэлефона, маўляў, тэлефануй — усе праблемы будзем вырашаць напрамую.

На прыёме ў кіраўніка раёна ад абстрактных дамоўленасцяў перайшлі да канкрэтных: рамонт пад'езда, які пакутуе ад перманентнай волкасці, запланаваны на першы квартал наступнага года, узвядзенне адмосткі — на другі.

Зніклыя дзверы і ліфтавы квэст

Тым не менш Сяргей усё роўна незадаволены: які рамонт, калі каналізацыя працягвае забівацца? У рэшце рэшт неабходна даследаваць трубы і знайсці прычыну, а не змагацца з наступствамі. Праўда, тэрмінаў па гэтай справе пакуль не называюць. І калі вы думаеце, што каналізацыя — гэта адзіная праблема, ад якой жыхары адчуваюць дыскамфорт, то памыляецеся. Спіс пытанняў, якія неабходна вырашыць, уражвае сваёй бясконцасцю.

Яшчэ адзін глабальны галаўны боль усяго дома — ліфты. Нягледзячы на тое, што Сяргей жыве на першым паверсе і гэта яго, быццам бы, не павінна заклапочваць, ён грунтоўна ўзяўся за рашэнне і гэтай праблемы. Дарэчы, з ёй звязана практычна дэтэктыўная гісторыя: паўтара года таму павінны былі мяняць дзверы ў ліфтах. Прывезлі і ў пасажырскі, і грузавы, але калі ў першым іх усё ж такі ўсталявалі, то ў другім — на жаль. Паўтара месяца яны ляжалі без справы, а потым і зусім зніклі ў невядомым напрамку. Так што цяпер ліфт ламаецца з перыядычнасцю некалькі разоў на тыдзень.

Гэта пры тым, што тэрмін эксплуатацыі ліфтаў ужо выйшаў: ён і так 25 гадоў, а тут маласямейка, то-бок нагрузка яшчэ большая. Дарэчы, дом быў пабудаваны ўсяго ў 1991 годзе, хоць па сітуацыі, якая склалася, і можа здацца, што гэта прывітанне з 50-х ці, у крайнім выпадку, 60-х гадоў. Акрамя таго ў ліфтах не спрацоўвае аўтаматычная сістэма адкрыцця, а на рухомай падлозе яшчэ трэба знайсці кропку, стаўшы на якую, можна націскаць кнопкі, інакш яны ніяк не будуць рэагаваць на вашыя дотыкі. Так што для жыхароў дома паездка на ліфце ператвараецца ў штодзённы квэст на спрыт. Пры гэтым ад адзінай службы 115 прыйшоў адказ, што ліфты пачынены. Ну а што — як ніяк функцыю сваю ж выконваюць, хоць і эпізадычна.

«Давайце працаваць разам»

Гэтыя «а яшчэ», «а яшчэ» можна расцягнуць ледзь не на ўвесь газетны нумар. Напрыклад, пасля аварыі ацяпляльнай сістэмы ў пад'ездзе лопнулі батарэі, іх замянілі на трубы і астатнюю работу ў прамым і пераносным сэнсе слова замарозілі. Камунальнікі паабяцалі сёлета вярнуць чыгунныя трубы: іх усталююць з іншых дамоў у Чыжоўцы, дзе зараз праходзіць планавая замена. На новыя няма грошай, але ўсё ж лепш, чым амаль нічога.

Таксама Сяргей незадаволены тым, як праводзіцца прыборка, што кантэйнеры смеццязборнікаў наўпрост прылягаюць да пад'езда, што ў доме не працуе пажарная сістэма. Нават тыя пытанні, якія вырашаюцца, не даводзяцца да канца. У доме замацавалі праводку, праклалі яе ў кораблы — гэта добра, усталявалі новыя свяцільнікі — таксама, праўда, старыя не знялі, мабыць, пакінулі для дэкору. Самае смешнае — апраўданне, маўляў, няма неабходнага інструмента. Сяргей нават прапанаваў сваю асабістую дапамогу: ён гатовы паўдзельнічаць і ў іншых работах, але ад гэтага ветліва адмовіліся. Тым не менш мужчына вырашыў хоць што-небудзь зрабіць сваімі рукамі і падстругаў драўляныя дзверы ў пад'ездзе, каб яны зачыняліся.

А каб мець больш уплыву і юрыдычнай сілы, Сяргей вылучыўся на пасаду старэйшага па пад'ездзе і, зразумела, быў абраны адзінагалосна. Мужчына прызнаецца, што практычна ўсё жыццё працаваў на сябе, таму прызвычаіўся адстойваць свае правы. Праўда, з камунальнымі службамі сутыкнуўся ўпершыню. Але да ўзаемадзеяння з імі ён рыхтуецца грунтоўна: вывучае нарматыўныя прававыя акты, да таго ж для разумення таго, што адбываецца, дапамагае тэхнічная адукацыя. Дарэчы, Сяргей вядзе групу ў сацыяльнай сетцы «УКантакце», дзе падрабязна распавядае пра перыпетыі са сваім домам.

— Спадзяюся, нам удасца пазбавіцца ад не надта прыемнай славы пакінутага ўсімі дома на сямі вятрах. І мы будзем жыць з заслужаным камфортам, — падвёў выснову сапраўдны гаспадар.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

Стан пад'езда на першым паверсе.

Пляцоўка збору смецця ў непасрэднай блізкасці ад пад'езда.

ПАСТСКРЫПТУМ

На гэтым тыдні жыхарам дома прыйшоў адказ ад ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», у якім сказана, што ў ходзе камісійнага абследавання ўстаноўлена, што ў тэхнічным падполлі цечы і засораў трубаправода сістэмы каналізацыі не выяўлена. Прыборка і дэзынфекцыя тэхнічнага падполля ДП «ЖЭУ №6 Заводскага раёна г. Мінска» праведзена, памяшканне знаходзіцца ў здавальняючым санітарным стане. Праёмы падвальных вокнаў у цяперашні час закрыты металічнымі рашоткамі. Адмостка гэтага жылога дома мае выбоіны, часткова адсутнічае. У месцах агульнага карыстання знойдзены дэфекты аздобнага пакрыцця (сколы, выбоіны, расколіны, адслаенне фарбавальнага пакрыцця і тынкаванага слою, наяўнасць надпісаў), таксама патрабуецца замена свяцільнікаў. У цяперашні час вядуцца работы па ўстаноўцы святлодыёдных свяцільнікаў. Прыбор ацяплення на першым паверсе знаходзіцца ў працоўным стане, але не адпавядае праектнаму рашэнню (выраблены з трубаправода). Завяршыць работы па ўстаноўцы святлодыёдных свяцільнікаў і ўсталяваць прыбор ацяплення ў адпаведнасці з праектным рашэннем плануецца ў снежні бягучага года.

Работы па рамонце адмосткі і заладцы падвальных вокнаў у жылым доме ўключаны ў план бягучага рамонту на II квартал 2018 года. Бягучы рамонт месцаў агульнага карыстання (МАК) уключаны ў план рамонту пад'ездаў на II квартал 2018 года. У ходзе правядзення бягучага рамонту МАК у паказаным жылым доме работы па аднаўленні пашкоджанага аздобнага пласта ўваходнай групы, агульнага тамбура і пляцоўкі першага паверха, будуць выкананы за кошт сродкаў ДП «ЖЭУ №6 Заводскага раёна г. Мінска».

Зварот будзе знаходзіцца на кантролі да канца чэрвеня наступнага года.

«ЭЛЕКТРАЖЫЛЛЁ» ЎЖО НЕ ФАНТАСТЫКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Інфармацыя ў інтэрнэце аб тым, што з 2018 года ўсе новабудоўлі будуць здавацца выключна з электраплітамі, а дамы з газавымі плітамі стануць рэдкасцю, выклікала вялікі рэзананс... Ці так гэта?

— Меркаванне, што мы зараз усе будзем пераходзіць на электрычнасць, у прынцыпе не зусім дакладнае. Там, дзе ёсць цеплавыя магутнасці, дзе цеплакрыніцы падключаныя, усё будзе і далей працаваць у ранейшым рэжыме. Тэма дадатковага выкарыстання электрычнасці закранаецца толькі ў тых выпадках, дзе недастаткова магутнасцяў і няма адпаведных цеплавых сетак, і яшчэ для таго, каб спрасціць неабходную інфраструктуру і паменшыць выдаткі на яе стварэнне. Гэта не значыць, што цяпер мы пачнём масава адмаўляцца ад газу і будзем будаваць дамы выключна з электраплітамі. Абодва варыянты будуць выкарыстоўвацца зыходзячы з магчымасцяў і патрэб і згодна з рацыянальным выкарыстаннем існуючых магутнасцяў. Цеплавыя станцыі ніхто закрываць не будзе. Па гэтым пытанні запланаваны ўзважаны збалансаваны падыход.

— З улікам гэтых перспектыў частка новабудоўляў будзе ўсё ж сапраўды праектавацца з цалкам электрычнай «начынкай». Калі мы іх убачым?

— Налета згаданыя аб'екты будуць пачынаць узводзіць з такім разлікам, каб яны былі здадзены ў эксплуатацыю да моманту пуску БелАЭС. Да гэтай даты будзе пабудавана прынцыпова новае «электрычнае» жыллё. Цяпер у такім кірунку распрацоўваюцца тэхнічныя прылады па больш рацыянальным выкарыстанні электрычнасці для ацяплення і падагрэву вады. Распрацоўваюцца нарматывы кошту электрычнасці для азначаных патрэб, а таксама вядзецца іншая падрыхтоўчая работа.

— Цяпер аб больш блізкай перспектыве. Як рэалізуецца Указ №240 — аб адрасным субсідаванні ў жыллёвым будаўніцтве?

— Справа па гэтым дакументе актывізавалася.

— Субсідыі і крэдыты сёння выдае адзін банк?

— Не. Гэтым займаюцца Беларусбанк, Белагрпрамбанк, БПС-Ашчадбанк і Белінвестбанк.

— Што датычыцца саміх тэмпаў выдачы крэдытаў?

— Усяго на адраснае субсідаванне ў жыллёвым будаўніцтве ў 2017 годзе прадугледжана 209 млн рублёў. Дзяржаўныя субсідыі могуць выдзяляцца на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманым грамадзянамі ў любым з названых камерцыйных банкаў, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама на пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах.

Па стане на 8 снежня прынята 3520 рашэнняў па выдзяленні субсідый, заключана 1860 дагавораў, у тым ліку на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва — 486 дагавораў. Аб'ём адкрытых крэдытных ліній па гэтым кірунку складае 95,6 млн рублёў, у тым ліку — 28,9 млн рублёў на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Акрамя таго, калі для рэалізацыі праекта спатрэбіцца большая сума, то банкаўская сістэма можа раскашэліцца і болей.

Менавіта таму мы разлічваем максімальна выбраць гэтыя крэдыты да канца года для таго, каб ажыццявіць максімальнае замяшчэнне 13-га ўказа 240-м указам.

— Які аб'ём субсідый плануецца накіраваць у будаўніцтва ўжо ў наступным годзе?

— Па рэалізацыі 240-га ўказа запланавана выдзеліць 530 млн рублёў. А ў цэлым фінансаванне па ўказах 13-м і 240-м дазволіць пабудаваць з дзяржаўнай падтрымкай не менш чым 900 тысяч квадратных метраў жылля.

Гэта дазволіць пабудаваць налета на 500 тысяч квадратных метраў жылля больш, чым запланавана па дзяржпраграме.

— Хто рэальна зможа разлічваць на адраснае субсідаванне ў наступным годзе?

— Як і сёлета, у наступным годзе дзяржаўная падтрымка сканцэнтравана на шматдзетных сем'ях. Каля 7 тысяч шматдзетных сем'яў мяркуецца забяспечыць жыллём у 2018 годзе. На самай справе гэта няшмат, таму што па стане на 1 студзеня 2017 года ў нас у жыллёвай чарзе налічвалася 30,4 тысячы шматдзетных сем'яў.

Так, з іх дзесьці 5 тысяч цяпер знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва, яшчэ 7 тысяч прыступяць да будаўніцтва ў наступным годзе. Але гэтага недастаткова, бо чарга рухаецца вельмі марудна. Не забяспечваецца на працягу года магчымасць уступлення ў будаўніцтва ў якасці шматдзетнай сям'і на працягу года. Гэта назіраецца ў цэлым шэрагу рэгіёнаў, асабліва ў буйных гарадах, у тым ліку ў Мінску.

— Якія яшчэ катэгорыі могуць спадзявацца на атрыманне адрасных субсідый?

— Установлена доля для вайскоўцаў — да 10% ад аб'ёму ўсёй дзяржаўнай падтрымкі. А астатняе, што будзе заставацца, трэба ўмоўна дзяліць на 16 катэгорый, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку згодна з чарговай.

Мы з даволі вялікай доляй аптымізму глядзім у будучыню, спадзяёмся, што калі агульнаэканамічныя тэндэнцыі захаваюцца як і сёлета, то грошай па 240-м указе ў банкаўскай сістэме будзе выдзелена і больш. Што я маю на ўвазе? Зараз цэлы шэраг камерцыйных банкаў прыглядаецца да схемы 240-га ўказа і зацікаўлены ўключыцца ў крэдытны працэс з уласнымі сродкамі. Крэдытныя лініі адкрываюцца выключна за кошт уласных грошай банкаў.

— Ці плануюць у нас далей будаваць арэнднае жыллё?

— Па арэндным жыллі трэба захаваць узровень бягучага года. Гэта звязана з тым, што бюджэтныя рэгіянальныя магчымасці не дазваляюць павялічваць фінансаванне. Акрамя таго, у мінулым годзе і ў гэтым ішоў завяршальны этап прыватызацыі дзяржаўнага жылля. Былі даволі вялікія паступленні ад прыватызацыі, якія накіроўваліся на будаўніцтва. Прыватызацыя скончылася, і крыніца фінансавання будаўніцтва арэнднага жылля закрылася. Цяпер аб'ёмы папаўняюцца толькі за кошт зваротных сродкаў наяўнага жылога фонду. А гэта няшмат.

— Як ідуць справы з развіццём праектаў узвядзення гарадоў-спадарожнікаў?

— На жаль, нейкага прарыву ў гэтым кірунку цяпер мы не бачым. Узровень выканання задач прыкладна на тым жа паказчыку, як і летась. Для спадарожнікаў у першую чаргу складана вырашыць пытанні па стварэнні інфраструктуры. Там вельмі вялікія выдаткі менавіта на новых пляцоўках, якія не забяспечаны неабходнымі камунікацыямі. Плюс неабходна падцягваць да пэўнага ўзроўню агульнагарадскія аб'екты — ачышчальныя збудаванні, падачу вады і астатняе, каб дадатковыя раёны далучыць. А аб'ём фінансавання інфраструктуры застаецца на ўзроўні 2016 года. Ён не павялічваецца, таму і магчымасці масавага развіцця інфраструктуры ў новых раёнах гарадоў-спадарожнікаў істотна абмежаваныя.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

У ТЭМУ

Памер субсідыі на выплату часткі працэнтаў для сем'яў з трыма непаўналетнімі дзецьмі будзе раўняцца стаўцы рэфінансавання плюс 2%, з чатырма і больш непаўналетнімі дзецьмі — стаўцы рэфінансавання плюс 3%, з трыма і больш дзецьмі да 23 гадоў, для дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, — стаўцы рэфінансавання плюс 2%. Сем'ям з чатырма і больш дзецьмі асноўны доўг будзе пагашаны на 100%, з трыма дзецьмі ва ўзросце да 23 гадоў — на 95%, дзецям-сіротам — на 35%, маладым сем'ям пры нараджэнні аднаго і дваіх дзяцей — на 10% і 20% адпаведна.

«Беларуская савецкая рэспубліка павінна была з'явіцца ўжо ў 1917 годзе»

Размова пра нашу дзяржаўнасць — пра яе герояў, перамогі і паражэнні

Гісторыя любой краіны — гэта велізарны пласт інфармацыі, які можна трактаваць па-рознаму. Галоўнае ва ўсёй гэтай разнастайнасці — захоўваць ясны погляд і абапірацца на факты. Перыяду станаўлення беларускай дзяржаўнасці прысвечаны не адзін дзясятак навуковых даследаванняў. Менавіта сёлета да гэтай тэмы зноў праяўляецца асаблівая цікавасць, бо 2017 год юбілейны: 100 гадоў Кастрычніцкай рэвалюцыі, акурат у гэтыя дні таксама 100 гадоў назад у Мінску праходзіў Першы Усебеларускі з'езд... Аб значэнні падзей стагадовай даўнасці для Беларусі, аб паралелях, якія можна правесці з таго часу ў дзень сённяшні, мы пагутарылі з дэканам факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, гісторыкам, палітолагам і публіцыстам Вадзімам ГІГІНЫМ.

Фота БЕЛТА.

СУВЯЗЬ МІНУЛАГА І СУЧАСНАГА

— Непасрэднай нагодай для цяперашняй размовы стаў 100-гадовы юбілей Першага Усебеларускага з'езда. Што можна назваць вытокамі беларускай дзяржаўнасці яшчэ да той лёсавызначальнай падзеі?

—У прэамбуле да Канстытуцыі напісана, што мы, народ Рэспублікі Беларусь, абапіраемся на шматвекавую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці. Вядома, гэта пытанне няпростае. Беларуская дзяржаўнасць альбо дзяржаўнасць на беларускіх землях? Таму што існуе некалькі азначэнняў, што такое нацыя, нацыянальная дзяржава. Ёсць нацыя як этнас, а ёсць палітычная нацыя, якая аб'ядноўвае ўсе народы, што пражываюць на пэўнай тэрыторыі.

Зразумела, нацыянальная дзяржаўнасць узнікае ў XX стагоддзі, але розныя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі існавалі і да таго. Вядомы беларускі гісторык, прафесар Мікалай Сташкевіч калісьці сфармуляваў чатыры праблемныя блокі, якія выклікаюць дыскусію аб паходжанні беларускай дзяржавы. Першы — гэта старажытнарускі перыяд, адносіны Полацка і Кіева. Якой была Старажытная Русь? Гісторыкі і публіцысты адказваюць на гэтае пытанне па-рознаму.

Другі праблемны блок датычыцца этнічнага характару Вялікага Княства Літоўскага. Чыя гэта была дзяржава? Трэці — месца і роля беларускіх зямель у Рэчы Паспалітай, той перыяд, калі дзяржава існавала, але адбываўся працэс інтэнсіўнай паланізацыі, які скончыўся ў XVIII стагоддзі практычна знікненнем старабеларускай культуры, яе паглынаннем польскай культурай. У чацвёртым блоку Мікалай Стэфанавіч аб'ядноўваў расійскі і савецкі перыяды, хоць я б іх падзяліў. Гэта становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, а таксама праблема савецкай дзяржаўнасці, стаўленне да БССР і БНР.

Сапраўды, пытанняў шмат, але відавочна, што працэс стварэння дзяржавы пачаўся не ў 1917 годзе, а значна раней.

— Ці можна называць сучасны Усебеларускі народны сход, які праводзіцца для вырашэння найважнейшых пытанняў дзяржаўнага маштабу, працягам Першага Усебеларускага з'езда?

— Не проста можна, яно так і ёсць на самай справе. У 1996 годзе ў перыяд палітычнага крызісу ў краіне абдумвалі, як аб'яднаць нацыю, як правесці сход народных прадстаўнікоў і якую даць яму назву. Мне давялося асабіста размаўляць з тымі людзьмі, якія мелі да гэтага прамое дачыненне, працавалі тады ў Адміністрацыі Прэзідэнта, а таксама з навукоўцамі, з якімі тады раіліся, дапамагалі саветам. Карані збору прадстаўнікоў усяго народа сыходзяць менавіта ў Народны сход Заходняй Беларусі ў кастрычніку 1939 года, які аформіў далучэнне гэтай часткі да БССР. Ну і, вядома, першакрыніца ідэі такога сходу — Усебеларускі з'езд. Само слова — усебеларускі — адсылае нас якраз да 1917-га.

Чым унікальны той з'езд? Так, яго разагналі бальшавікі Заходняга фронту, бо не жадалі дзяліцца ўладай, якую яны толькі-толькі захапілі. Але ж з'езд змог адбыцца, бо менавіта бальшавіцкае кіраўніцтва, а дакладней — асабіста Ленін і Сталін — падтрымалі яго правядзенне. Парадаксальны факт: дэлегаты прымаюць рэзалюцыю, у якой прызнаюць Савецкую ўладу, і тут жа прадстаўнікі гэтай улады з'езд разганяюць. Самавольства! І яго рэзка раскрытыкавалі ў Петраградзе, запатрабавалі правесці новы з'езд. Мяснікоў, Кнорын і Ландэр, ініцыятары разгону, круціліся-круціліся, але пад ціскам з цэнтра вымушаны былі пачаць падрыхтоўчую работу. І толькі нямецкае наступленне перапыніла яе. У Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў, якім кіраваў Сталін, не сядзелі склаўшы рукі, і ў студзені 1918 года стварылі ў Петраградзе Беларускі нацыянальны камісарыят. Менавіта гэты орган адыграў выключную ролю ў стварэнні беларускай савецкай дзяржаўнасці. Набліжаецца стагадовы юбілей Белнацкама, і нам трэба годна яго адзначыць. Спадзяюся, за гэтую справу возьмецца і беларуская дыяспара ў Расіі.

На з'ездзе былі прадстаўлены людзі розных палітычных поглядаў — у асноўным, вядома, сацыялісты. Там нават святар быў, прычым не адзін. Гэта было ўнікальнае для рэвалюцыйнага часу яднанне людзей. Ад сялян і простых салдат да акадэміка Карскага. Чаму пасля разгону ў лютым 1918 года вакол Выканаўчага камітэта на некаторы час аб'ядналіся і Мінскае земства, і гарадская ўправа? Таму што бачылі ў гэтым органе легітымнасць, што і дае слова «ўсебеларускі», якое азначае прадстаўніцтва ўсяго народа.

ПРЫЧЫНЫ ПАРАЖЭННЯ

— Чаму БНР, створаная ў сакавіку 1918 года, не паспела стаць сапраўднай дзяржавай за невялікі тэрмін свайго існавання?

— Галоўнае тут тое, што нельга было стаць дзяржавай ва ўмовах замежнай акупацыі. Немцы не падтрымлівалі ідэю БНР, хоць яе лідары і разлічвалі на іх апеку — гэта першае. Другое — не было народнай падтрымкі. Тыя людзі, якія стваралі БНР, з'яўляліся прадстаўнікамі палітычных сіл, якія прайгралі выбары ва Устаноўчы сход. Практычна ўсе гісторыкі прызнаюць, што тыя выбары былі дэмакратычныя. І партыі, якія ўдзельнічалі ў стварэнні БНР, перш за ўсё — БСГ, іх прайгралі. Па ўсіх выбарчых акругах, дзе яны вылучалі сваіх кандыдатаў, уключаючы Калужскую губерню (там жылі беларускія бежанцы), за іх прагаласавала крыху больш за 30 тысяч чалавек. Натуральна, калі няма падтрымкі ў народзе, то як можна рэалізаваць любую ідэю?

Акрамя таго, не было падтрымкі з боку астатніх партый краю. Як толькі 25 сакавіка 1918 года была прынятая Трэцяя ўстаўная грамата, меншавікі, эсэры і іншыя ад БНР адышлі. А гэта былі людзі, выбраныя народам, прадстаўнікі земскага і гарадскога самакіравання. Без іх Рада БНР літаральна разгубілася, так і з'явілася знакамітая тэлеграма кайзеру. Бежанскія арганізацыі, што дзейнічалі на тэрыторыі Савецкай Расіі, вельмі рэзка крытыкавалі дзейнасць БНР. Дастаткова пачытаць газету «Дзянніца», друкаваны орган Белнацкама. А якраз дзеячы бежанскай беларускай грамады потым у значнай ступені і стваралі БССР. Вось вам і сукупнаць фактараў, якія не дазволілі рэалізавацца БНР як дзяржаве.

Калі пачытаць Луцкевіча і Цвікевіча — лідараў БНР, якія пакінулі дзённікавыя запісы альбо ўспаміны пра той час, — ужо ў 1919 годзе ў іх было поўнае расчараванне ў тым, што адбываецца. І многія дзеячы БНР потым перайшлі на савецкі бок. Вядома, большасць з іх рэпрэсавалі ў 30-я.

— Дык а які ж ідэал дзяржаўнасці бачылі самі дэлегаты Першага Усебеларускага з'езда?

— Добра было б запытаць іх саміх. Паколькі такой магчымасці ў нас няма, то варта звярнуцца да дакументаў, найперш той рэзалюцыі, якую яны паспелі прыняць. У ёй прама гаворыцца пра прызнанне Савецкай улады і неабходнасці будаваць новую рэспубліку на савецкім падмурку. Таксама падкрэсліваецца неабходнасць падтрымліваць дзяржаўную сувязь з Расійскай дэмакратычнай рэспублікай. Гэта праграма дэманструе ідэалагічную пераемнасць беларускага руху. Бо вельмі падобныя патрабаванні мы можам знайсці ў часопісе «Гоман», што выдаваўся ў 1884 годзе беларускімі народнікамі. Фактычна ўжо ў 1917 годзе павінна была з'явіцца на свет Беларуская савецкая рэспубліка. З такой мэтай Саўнаркам і падтрымаў правядзенне Першага Усебеларускага з'езда. Паглядзіце: у той жа час ствараюцца савецкія рэспублікі на неакупаванай частцы Латвіі, Украіне. Дарэчы, магчыма, тая няспраўджаная рэспубліка называлася «Беларуская народная рэспубліка Саветаў», бо менавіта аналагічную назву насіла дзяржава, створаная ў снежні ў Харкаве. Толькі, вядома, не Беларуская, а Украінская. Але свавольствы групы Мяснікова—Кнорына—Ландэра, а потым і нямецкае наступленне замарудзілі гэты працэс і адклалі яго аж да 1 студзеня 1919 года.

СІЛА ЧАЛАВЕКА

— Якія асобы, на ваш погляд, аказалі найбольшы ўплыў на станаўленне беларускай дзяржаўнасці?

— Я не прыхільнік называць нейкіх канкрэтных людзей, тым больш за такі вялізарны перыяд. Вось назавеш ты ваеннага, палітыка і дзеяча культуры — а іншыя? Дарэчы, беларусы — вельмі мудрыя людзі, бо па сацыялагічных апытаннях сярод найбольш папулярных гістарычных дзеячаў яны вылучаюць тых, хто не выклікае супярэчнасцяў. Гэта тыя фігуры, якія нацыю аб'ядноўваюць, паколькі, як і ў гісторыі любой дзяржавы, у нас былі вельмі супярэчлівыя дзеячы. Дык вось, найбольш папулярныя гістарычныя персанажы ў нас — гэта Францыск Скарына, Янка Купала, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, а следам звычайна ідзе Пётр Машэраў. Падкрэслю, што паслядоўнасць можа быць і іншая. Да Машэрава, як савецкага палітыка, могуць ставіцца па-рознаму, але збольшага стаўленне станоўчае да ўсіх гэтых імёнаў.

Каб праілюстраваць, наколькі складаная і непрамалінейная гісторыя, прывяду такі прыклад. Я разумею, у кагосьці гэта можа выклікаць раздражненне, але значны ўклад у тое, што Беларусь стала асобнай савецкай рэспублікай, унёс Іосіф Сталін. І ў скліканні з'езда, і ва ўтварэнні БССР, потым яе ўзбуйненні, і ў далучэнні Заходняй Беларусі ён адыграў вялікую ролю. Так, гэта быў крывавы дыктатар і тыран, але ж без яго ўявіць развіццё беларускай дзяржаўнасці немагчыма.

— Калі б у вас была магчымасць паўдзельнічаць і ў Першым Усебеларускім з'ездзе, і ва Усебеларускім народным сходзе, то якія прапановы вы б унеслі?

— Што датычыцца вяртання ў 1917 год, то Усебеларускі з'езд — гэта толькі адзін, хоць і вельмі важны, эпізод рэвалюцыйнай эпохі. І не дай нам Бог вярнуцца ў тое бурлівае і крывавае ліхалецце. Паглядзіце на прыклад некаторых нашых суседзяў, якія перажываюць падобную сітуацыю зараз. У Беларусі не было такога масавага тэрору, як на Кубані, Паволжы, ва Украіне, Сібіры. Напрыклад, усіх арыштаваных на з'ездзе амаль адразу адпусцілі. Першы «чырвоны» расстрэл у Беларусі па прыгаворы рэвалюцыйнага трыбунала адбыўся ў ноч з 28 лютага на 1 сакавіка 1918 года, калі пры падыходзе немцаў да Магілёва бальшавікі забілі ксяндза і двух афіцэраў. Пакуль яшчэ час быў адносна мяккі, але літаральна праз пару месяцаў пачнецца крывавы віхор Грамадзянскай вайны.

Мы павінны разумець, што беларуская дзяржаўнасць стваралася ва ўмовах вельмі жорсткай, жудаснай вайны. Так што вяртацца ў той час нават заўтра не варта.

Усебеларускі з'езд праходзіў ва ўмовах рэвалюцыі, а Усебеларускі народны сход стаў сімвалам дзяржаўнай і палітычнай стабільнасці, што з'яўляецца візітнай карткай нашай краіны. Прэзідэнт як ключавая фігура нашай палітычнай сістэмы ў сваёй дзейнасці абапіраецца на народную падтрымку. І тое, што раз у пяць гадоў праходзяць такія сходы, куды выбіраюць людзей розных прафесій, узростаў, рэгіёнаў, яскравы паказчык таго, што менавіта народ з'яўляецца крыніцай улады. Вы спыталіся пра прапановы... Відавочна, пажадана, каб гэтая стабільнасць захоўвалася і ў будучыні. Бачыце, дзве падобныя падзеі, але наколькі розныя па сваіх абставінах. Час розны...

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

27 декабря 2017 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гранд Фэшен Хаус»

Повестка дня:

О реорганизации Общества.

Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева,13.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева,13.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 21 декабря по 26 декабря 2017 г. с 9.00 до 16.00 либо 27 декабря 2017 года по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 20 декабря 2017 года.

Начало регистрации участников собрания: 9.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

УНП 290671335

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Мозырский НПЗ»

Лот №1.

1. Наименование: Административное помещение с инвентарным номером 500/D-685070, 1948 г. п. Площадь – 590,0 м². Назначение: Административное помещение. Примечания: помещение расположено на 1–3-м этажах. Сооружения дворовые: забор металлический (38,5 м²) с воротами, инв. №49339; плитка тротуарная с бордюром, площадь 212,6 м², инв. №49340.

2. Внутренние коммуникации и оборудование: кабель телефонный с абонентской коробкой с инв. №49331; теплоузел с инв. №49332; шкаф со встроенным оборудованием с инв. №49333; - электрическая силовая компьютерная сеть с инв. №49334; электрическая силовая сеть с инв. №49335; охранно-пожарная с инв. №49336; система кондиционирования воздуха с инв. №49337; объектовое оконечное устройство передачи извещения с инв. №49338.

Начальная цена с НДС – 661 809,91 бел. руб. **Задаток** – 66 180,99 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5%. **Адрес лота №1:** г. Минск, ул. Кабушкина, 66, пом. 1

Обременения: 1.Часть помещения с инв. №500/D-685070 сдается по договорам аренды: 89,8 м² по 31.01.2018; 53,4 м² договор аренды от 31.01.2014 действует в течение 4 лет

Земельный участок. Изолированное помещение с инв. №500/D-685070, расположено в здании с инв. №500/C-5114, под обслуживание которого выделен земельный участок площадью 0,0555 га с кадастровым номером 500000000002001863. Целевое назначение земельного участка: эксплуатация и обслуживание части здания. Право постоянного пользования.

Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в санитарно-защитных полосах водоводов: санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 0,0178 га; санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 0,0024 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Аукцион состоится 24.01.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Мозырский НПЗ», проводимом 24 января 2018 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 22.01.2018 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Нечаев Сергей Викторович, тел. 8 029 656 85 61.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.06.2017 г.

Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

■ Што людзі пішуць

«ТЫ ЛЮБІШ ЧЫТАЦЬ ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»? — «ЛЮБЛЮ...»

У гэтым дыялогу ўсё правільна, усё па-беларуску!

Ад дарожна-транспартных здарэнняў не застрахаваны, на жаль, ніхто, і смешнага ў іх, вядома ж, нічога, калі за справу не бярэцца мастак...
На тым малюнку — машына (за рулём — юнак, лічба на шапцы 2018), можна сказаць, збівае свайго старэйшага сабрата (з лічбай 2017). Ды яшчэ і крычыць: «Куды прэш, стары? Жыць надакучыла?» Не ведаю, як каму, а мне гэты малюнак нагадаў трохі сумнае:
Апошнія лісткі ў календары...
Сыходзіць год — самотны і стары.
Значыць, самы час «аддаваць даўгі» — друкаваць лісты, у якіх, як быццам, нічога такога... І тым не менш.

«Я жыву за 50 кіламетраў ад Мінска і бываю там часта, — піша **спадарыня Тамара Кулеш з Вілейшчыны,** *— праведваю сыноў, сяброў. Мне падабаецца ехаць, бачыць новыя мясціны, новыя твары... Карацей, я з задавальненнем баўлю час у горадзе і такім чынам уношу перамены ў сваё жыццё, збіраю ўражанні.*

Не так даўно, напрыклад, — успамінае спадарыня Тамара, *— вярталася дамоў. Усе месцы ў аўтобусе былі занятыя «ў адпаведнасці з купленымі білетамі». Але ж перад самым адпраўленнем у салон зайшлі яшчэ дзве пажылыя жанчыны. «Некалі, — думаю, — ім адразу ўступілі б месца. А цяпер... Моладзь сядзіць, уткнуўшыся ў свае смартфоны — нікога і нічога вакол не бачыць...» Толькі пра гэта падумала, як адзін з маладых пасажыраў устаў, тое ж, моўчкі (рухам рукі), загадаў хлапцу ў навушніках. Жанчыны селі, а ў мяне пасвятлела на душы.*

Усю дарогу дамоў, — працягвае спадарыня Тамара, *— я з удзячнасцю думала пра гэтага мужчыну, пра яго бацькоў. У мяне нават з'явілася надзея, што не ўсё так дрэнна: добрая ў нас моладзь...»*

Звярніце ўвагу — для таго, каб адзін чалавек прыйшоў да гэтай высновы, другому не спатрэбілася, можна сказаць, нічога. Ён зрабіў тое, што павінен быў: нічога дзіўнага.

Але ж мы знаходзім яго — нават там, дзе няма. У грамадскім транспарце, у крамах, на вуліцах з цікавасцю, напрыклад, прыслухоўваемся і прыглядаемся да тых, хто размаўляе ці чытае па-беларуску, пытаемся ў іх, а чаму? Хоць, здавалася б, што тут дзіўнага: свая краіна, свая мова. Ёй бы жыць-панаваць на гэтай зямлі. Але ж...

«*Так склалася,* — піша **спадар Яўген Шастакоў з Гомеля,** *— што ў нашай краіне наша, беларуская, мова не займае пакуль належнага месца. І зойме яго не хутка, нават тады, калі да справы далучацца новыя, куды большыя сілы...»*

«Праблема з мовай і сапраўды вельмі сур'ёзная», — сцвярджае спадар Шастакоў. І расказвае аб трох уласных, вельмі важных для сябе сустрэчах, звязаных з першай дзяржаўнай...

Такім чынам, сустрэча першая. «*Аднойчы я, тады пяцігадовы, разам з бацькамі (сям'я рускамоўная) стаяў ля будынка школы і спакойна глядзеў на дзяцей... Як раптам з брамкі суседняй хаты выскачылі трое... босых хлопчыкаў, узбеглі на ледзяную горку, з крыкам з'ехалі ўніз і зніклі за той жа брамкай. «Трушкі», — з павагай прамовіў нехта з дарослых.*

Прайшло некалькі месяцаў. Сям'я гэтых Трушкоў (усіх братоў было пяцёра) пасялілася на нашай вуліцы, мы пазнаёміліся з Віктарам, маім будучым аднакласнікам, і нават паразмаўлялі, хоць разумелі, відаць, не ўсё. Я, напрыклад, спытаў у Віці: «Вы здесь живёте?» Хлопчык адказаў: «Нявож». Я паспрабаваў удакладніць, гэта «да» або «нет»? Адказам было маўчанне. Тады я пайшоў на хітрык: адарваўшы альховы ліст, спытаў: «Он зелёный?». Віця сказаў: «Нявож». Далей размова пайшла лягчэй, і я даведаўся шмат цікавага. Напрыклад, што ў іх ля дома ёсць... плот, што яны любяць есці «лындзікі», а галоўнае, што за сталом сядзяць на... сланах!

Мне так хацелася іх убачыць...

І якое ж расчараванне: пабываўшы ў Віці ў хаце, я даведаўся, што сланы (услоны) гэта звычайныя лаўкі, «лындзікі» — аладкі з бульбы і жменькі мукі, а плот не што іншае, як агароджа...

Сустрэча другая. Даўным-даўно, — успамінае спадар Шастакоў, *— у дзяцінстве, у часопісе «Бярозка» я прачытаў апавяданне (назву не помню) Хведара Жычкі пра школьніка, які ездзіў на веласіпедзе. Хлопчык быў наш, звычайны, яго сябры — таксама. З незвычайнага — хіба... няўлоўны вецер — у твар, насустрач, подых якога ў памяці і сёння.*

Сустрэча трэцяя.

Гадоў праз колькі разам з бацькам-настаўнікам (ён ехаў на жнівеньскую нараду) я трапіў у Чачэрск. Татавых калег там сабралася шмат. Усе (рэдка ж бачацца) весела віталіся, а ля кнігарні — яшчэ і жыва штосьці абмяркоўвалі.

Мы з бацькам таксама зайшлі туды. Першае, што здзівіла, — за прылаўкам стаяў... мужчына, крыху мешкаваты, гадоў сарака. Але ж, калі ён загаварыў, я аслупянеў наогул, бо размаўляў ён па-беларуску, і гэту мову — чыстую, літаратурную, не па радыё, не ў школе, а ў рэальным жыцці — я чуў упершыню...

У наступны мой прыезд у Чачэрск прадаўцом у той кнігарні ўжо была жанчына, якая размаўляла па-руску. Усё стала на свае месцы», — падсумаваў спадар Шастакоў.

Што цікава, ліст яго напісаны на досыць добрай беларускай мове. Значыць (дурань думай багацее... Гэта я, вядома ж, пра сябе), трох (!) «сустрэч» з мовай ды ўрокаў у школе было дастаткова, каб вывучыць яе, каб на ёй чытаць (у тым ліку «Звязду»), каб пісаць. Прычым — не толькі самому: некалькі цікавых матэрыялаў даслала жонка спадара Шастакова. Супрацоўнічае з газетай і сын.

«...Беларусы цураюцца мовы свайго народа, — прызнае і **спадарыня Наталля Ціханоўская з Мсціслаўшчыны,** *— дрэнна ведаюць яе, размаўляюць на трасянцы. Не скажу: ёсць людзі пісьменныя, але ж яны ўсё больш аддаюць перавагу рускай мове, лічаць прэстыжным вывучэнне замежных. Але ці задумваюцца пры гэтым, што спачатку трэба вывучыць родную, беларускую. Тыя ж японцы, французы, англічане ведаюць свае мовы, шануюць іх. Чым жа мы ці наша мова горшыя?»*

Вільгельм Гумбальт — найбольшы аўтарытэт у мовазнаўстве — сцвярджаў, што, як чалавек (народ) стварае мову, гэтаксама і мова стварае чалавека (народ). Кожная мова апісвае вакол народа, якому належыць, круг, выйсці з якога можна толькі ў тым выпадку, калі ўступіш у круг іншы. З гэтага вынікае: іншы круг — іншая мова. Іншая мова — іншы народ. *«Мы, маладыя, павінны шанаваць беларускае слова,* — працягвае спадарыня Ціханоўская, *— размаўляць на роднай мове, пісаць. Беларускасць павінна жыць у душы кожнага грамадзяніна краіны. Не трэба цурацца свайго спрадвечнага, адмаўляцца ад таго, што вылучае нас, як асобную нацыю».*

Але ж, як той казаў, пакуль маем, не зберагаем. Людзям і таму ж асобнаму чалавеку не ўласціва цаніць тое, што ёсць. І толькі страціўшы...

«Так атрымалася, што да мяне, — чытаем у лісце **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў,** — *цэлы месяц не прыходзіла «Звязда». І была ж як быццам работа (кожны дзень размеркаваны), і ёсць у хаце што пачытаць, але ж нечага ўвесь час не хапала: дні былі доўгія і нейкія пустыя. Затое потым...»*

У такой жа сітуацыі апынулася і яшчэ адна наша падпісчыца **з вёскі Броннае Рэчыцкага раёна. Ніна Дзянісаўна Гапоненка** («Звязда» пісала пра яе) газету выпісвае з першых пасляваенных гадоў (!). І тады, у маладосці, чытала ў ёй усё — да апошняга радка. Цяпер, у 90 (!) гэта ўжо складаней. Але ж і без газеты ніяк. Так што *«запрасіла я дамоў паштальёна Таццяну Іванаўну Ба-жэнка і афармліла падпіску»,* — паведамляе шаноўная чытачка. *— Больш за тое, некалькі нумароў газеты аддала на пошту, каб людзі таксама пачыталі і, магчыма, падпісаліся, бо шмат жа цікавага... У тым ліку — у дадатку «Мясцовае самакіраванне».*

«З людзьмі трэба размаўляць, — піша Ніна Дзянісаўна, якая, дарэчы, 27 гадоў была дэпутатам сельскага і раённага Саветаў, *— з імі трэба працаваць, аб'ядноўваць агульнымі справамі. Шмат што можа рабіць мясцовая ўлада, трэба толькі выбіраць туды актыўных людзей. Можа, такіх як наша бібліятэкар Галіна Мікалаеўна Кісель. Яна стараецца захаваць памяць пра ветэранаў вайны і нашага калгаса «40 год Кастрычніка», арганізавала хор. Да яе ў бібліятэку, хоць ёсць і школьная, пастаянна бегаюць дзеці...»*

Напэўна ж, чытаюць кніжкі. Магчыма, па-беларуску?

«Звязда» была першай газетай, якую я выпісаў, калі скончыў школу і стаў дарослым, — паведамляе **спадар Леанід Красоўскі з Бярэзіншчыны.** *— Чытаў яе, аж пакуль не з'ехаў у Латвію. Трохі там папрацаваў, але не прыжыўся — вярнуўся дамоў на Бацькаўшчыну, уладкаваўся на працу і зноў стаў выпісваць «Звязду»... Такім чынам ужо сорак гадоў я верны сябар газеты. З яе публікацый ведаю, як жывуць людзі, тут знаходжу навіны (у тым ліку пра надвор'е) і розныя парады, народны гумар. Лічу, што газета вучыць сваіх чытачоў жыццю, сапраўднаму патрыятызму і роднай мове...»*

Ліст ад **спадарыні Таццяны** з Мінска прыйшоў па электроннай пошце. Ён напісаны па-руску і змяшчае толькі адно пытанне: чаму родная газета на роднай мове называецца «Звязда», чаму не «Зорка»?

На гэта пытанне мы ўжо адказвалі, але ж нехта, магчыма, прапусціў інфармацыю, нехта забыўся, да таго ж у газеты пастаянна з'яўляюцца новыя чытачы... Таму яшчэ раз: у беларускай мове было і ёсць слова «звязда», «гвязда». Яго — нароўні з зорай, зоркай — падае, у прыватнасці, слоўнік Вацлава Ластоўскага (Коўна, 1924 год), а таксама «Беларуская энцыклапедыя» (Мінск, 1998 г., т. 7).

Паводле гэтага аўтарытэтнага выдання, «Звязда» — па-першае — штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выходзіць з 1917 года, а па-другое — рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары, атрыбут калядная абраднасці.

Далей у артыкуле ідзе досыць падрабязны расказ пра тое, з чаго і як ён, гэты атрыбут, рабіўся, чым упрыгожваўся, а таксама змешчана фатаграфія хлопчыка з вёскі Капылы Камянецкага раёна з гатовым вырабам.

Здымак зроблены ў 40-я гады мінулага стагоддзя. Але і ў гэтым — падчас Каляд звёзды, як сімвал сонца, па-ранейшаму «загараюцца»! Ахвотныя пераапранаюцца ў «мядзведзя», «казу» і «жорава», ходзяць па хатах — віншуюць гаспадароў...

Усё гэта яшчэ можна ўбачыць не толькі ў калядных сюжэтах па тэлебачанні, але і «жыўцом», што называецца, — у асобных гарадах і вёсках, у сталічным метро. Многім, праўда (як і аўтарцы ліста ў рэдакцыю), рэжа вуха слова «звязда», і таму сімвал сонца ўсё часцей называюць калядная зоркай...

Але ж, як той казаў, няведанне законаў не вызваляе ад адказнасці за іх парушэнне, а няведанне мовы не з'яўляецца падставай для таго, каб — крый Божа — мяняць назву газеты, за плячыма якой СТО (!) гадоў жыцця.

Дарэчы, на сто першым, на старонкі выдання вярнулася рубрыка, у якой можна атрымаць адказы на моўныя пытанні. Рыхтуюць іх нашы стыльрэдактары, а гадоў колькі таму рабіў гэта пісьменнік і перакладчык, аўтар буквара, які вытрымаў 23 выданні, спадар Анатоль Клышка. Дык вось ён, адказваючы на пытанне пра назву газеты, прыводзіў такі дыялог:

— Ты любіш чытаць газету «Звязда»?
— Люблю...
— А ці падпісаўся на яе?
— Так, падпісаўся.
— На паўгода?
— На паўгода».

Завяршаецца ж гэты артыкул аўтарскім (і аўтарытэтным) прызнаннем, што ўсё ў дыялогу правільна, усё па-беларуску!

Значыць, засталося падпісацца. Каб не забыцца мову, каб падтрымаць газету, каб чытаць — каму што даспадобы (пра здароўе, культуру, палітыку, адукацыю, грошы, сям'ю, спорт...), каб...

«Чытаю «Звязду» ўжо многія дзесяцігоддзі, — прызнаецца **спадар Анатоль Кашэвіч з Лепельшчыны.** *— Іншы раз радуюся, іншы — засмучаюся: думаю, газета павінна смялей пісаць пра жыццё людзей, асабліва тых, што засталіся ў невялічкіх вёсках: п'юць ваду з неправераных калодзежаў, ядуць прадукты са сваіх гародаў і лясоў, пазбаўляюцца працоўных месцаў і бытавых паслуг. А паспрабуй запасціся палівам...»*

У газеты, вядома ж, ёсць пэўны штат карэспандэнтаў. У хуткім часе нехта з іх можа атрымаць заданне (запасціся, напрыклад, тым самым палівам) — вывучыць праблему, падрыхтаваць артыкул. Але ж зрабіць гэта могуць і самі... чытачы: старонка «Зваротная сувязь» — ваша. Пішыце: нехта не дурны заўважыў, што калі праблем не ўздымаць, яны як бы не існуюць...

Валянціна ДОЎНАР,
рэдактар аддзела пісьмаў.

P. S. *Шчыры дзякуй спадару Уладзіміру Голубеву і многім іншым чытачам за добрыя словы на адрас рубрык «Простая мова», «...Народ на провадзе!» і «Хто каго?». Весці іх, прычым гадамі, справа, вядома ж, нялёгкая.*

Натхняе — што хоць некаму ды патрэбная.

P. P. S. *Расказвалі, рэкламу часопісу «Бярозка» Рыгор Барадулін (светлай памяці!) прапаноўваў зрабіць на пачках з запалкамі, на бутэльках са спіртным. У першым выпадку яна гучала б так: «Стой! Не запальвай папяроску. Ты сыну выпісаў «Бярозку»?!*

У другім... Перафразуем: «Цвярозы ты ці выпіўшы, але «Звязду» ўсё ж выпішы!»

■

ВЕРШ У ТЭМУ

Маміны словы

З мамінага слоўніка выцягваю
словы, нібы з попелу жарынкі,
грэць душу азяблую, асмяглую
на аўтобусных, тралейбусных прыпынках.
Колькі гукаў розных зорным россыпам
на губах пагаслі назаўсёды,
што мяне не раз парой марознаю
лашчылі ў завеі — галалёды.
Словы з вуснаў мамы — ратавальныя
ад бяды, ад злых сурокаў лёсу,
з імі, як паштоўкі прывітальныя,
і ў вясёлках, і ў снягах нябёсы.
Да мяне ішлі зямнымі вёрстамі
маміны не ўпохапку прызнанні
пра жыццё, дзе час касою востраю
не ў адных лугах касіў старанна.
Век на згадкі падкі, на пацешныя
прыказкі і з перчыкам, і з соллю.
Толькі болей з болем, а не смешныя,
маміны няспешныя выслоўі.
Мала ўзяць паспеў з твайго я слоўніка,
мама, незваротная, адзіная.
Без цябе блукаць, нібы бяздольніку,
што па вёсках з торбамі блудзілі.
З мамінага слоўніка, як з бохана
крошкі, што не скінуты пад ногі,
з новай ці сустрэнуцца эпохаю
запытацца мне ў якога Бога?

Віктар Ярац,
г. Гомель.

■ Псіхалогія для ўсіх

ПАРТРЭТ АХВЯРЫ І АГРЭСАРА

Сёння даволі шмат пішуць і кажуць пра хатні гвалт. Але што гэта?

Аказваецца, гэта тое, што вельмі і вельмі многія лічаць «нармальным жыццём». Абразы, прымушэнні, прыніжэнне годнасці, забароны працаваць, вучыцца, сустракацца з сябрамі і сваякамі, жорсткія абмежаванні ў фінансах і патрабаванне дэталёвай справаздачнасці, прычым нярэдка пры забароне зарабляць самастойна. Хатні гвалт існуе ва ўсіх сацыяльных групах, з ім сутыкаюцца незалежна ад узроўню даходаў, адукацыі і становішча ў грамадстве. Місію ахвяры жанчыне нярэдка навязваюць устойлівыя і шкодныя стэрэатыпы: «муж — галоўны кармілец у сям'і», «калі муж б'е жонку, то гэта справы сямейныя», «жанчына сама павінна падумаць, у чым яе віна», «дзецям патрэбны бацька — не важна які».

— Характэрнай асаблівасцю жанчыны-ахвяры з'яўляецца яе звычка сябе шкадаваць, — тлумачыць **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Настасся ХНЫКАВА.** — Пры гэтым яна, як правіла, не гатова прыняць на сябе адказнасць за тое, што з ёю адбываецца. Ахвяра заўсёды шукае знешняга вінаватага сваіх няшчасцяў, яна бачыць прычыну ўсяго, што з ёй адбываецца, у чалавеку, падзеі, абставінах. Жанчыну-ахвяру начальнік часта прымушае працаваць звышурочна, затрымлівацца да позняга вечара, у той час як усе іншыя ідуць дадому своечасова. Калі жанчына пагаджаецца на гэта, не адстойвае свае правы, не шукае падтрымкі ў навакольных, а толькі ўсім скардзіцца на сваё бязвыхаднае становішча, то, хутчэй за ўсё, яна і далей будзе атрымліваць дадатковыя заданні.

У ахвяры хатняга гвалту — нізкая самаацэнка, павышаная трывожнасць і ўнушальнасць, няўпэўненасць у сабе. У дарослых ахвяр назіраецца апраўданне дзеянняў крыўдзіцеля, гіпертрафіраванае пачуццё віны, падаўленае пачуццё гневу, упэўненасць у тым, што ніхто не можа рэальна дапамагчы. У жанчын — скажонае разуменне ролі жанчыны ў грамадстве і сям'і. Дарослая ахвяра баіцца агалоскі, асуджэння або празмерна балюча ўспрымае спачуванні навакольных. Часта жанчына-ахвяра атрымлівае псіхалагічную выгаду са свайго становішча — ёй перападае ўвага навакольных, падтрымка, спачуванне і дапамога. Іншымі словамі, пазіцыя ахвяры — эгаістычная. Таму так цяжка выйсці з гэтай ролі.

Што да агрэсараў, то яны, як правіла, самі цярпелі гвалт у дзяцінстве. У іх таксама нізкая самаацэнка і жаданне абвінавачваць іншых у тым, што адбываецца (мужчына-агрэсар можа прыпісваць жанчыне пастаянныя здрады). Часта яны выдатна разумеюць, у дачыненні да каго можна ці нельга праяўляць агрэсію. «Хатнія гвалтаўнікі» могуць быць у грамадстве на добрым рахунку. Агрэсар пасля ўчынення гвалту нярэдка падкупляе ахвяру — актыўна просіць прабачэння, загладжвае віну абяцаннямі, сексам, падарункамі, «аслабленнем рэжыму», што ў выніку дае толькі новыя нагоды для агрэсіі. Істотным фактарам для маніпулявання з'яўляюцца дзеці — «дзяцей не ўбачыш».

Сямейны гвалт — частка простага, прадказальнага цыкла. Пачынаецца ён з адчування напружанасці. Ахвяра нібы жыве на вулкане, перажывае прыгнечанасць і неспакой.

Каб усвядоміць праблему, звярніце ўвагу на некалькі маркераў агрэсіі:

- партнёр забараняе вам бачыцца з сябрамі або сваякамі, кантралюе, як і дзе вы праводзіце час;
- вы адчуваеце ціск на эмацыянальным, псіхалагічным узроўнях, чуеце пагрозы;
- партнёр прымушае вас да інтымных стасункаў;
- вас прыніжаюць у прысутнасці сяброў або сваёй сям'і;
- партнёр пастаянна крытыкуе за знешні выгляд, гатаванне ежы, паводзіны;
- вас пазбаўляюць ежы, грошай, сну

■

■ Трэба абследавацца

ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ ГАРМОН

Колькасць некаторых захворванняў шчытападобнай залозы прырастае, аднак злаякасных пухлін больш не становіцца

Для выяўлення праблем у шчытападобнай залозе мы ўсе здаём агульны аналіз крыві, па якім урач мяркуе, ці трэба нам абследавацца далей — рабіць ультрагук залозы і здаваць аналіз крыві на тырэатропны гармон (ТТГ). Дарэчы, калі вы вырашылі абследавацца самастойна, не выкідвайце грошы на вецер — не высвятляйце проста так пералік вялікай колькасці паказчыкаў. Калі з ТТГ і на ўльтрагуку ўсё ў парадку, можна спаць спакойна. Праз два гады ўсё можна паўтарыць.

Сёння ва ўсіх раёнах краіны ёсць магчымасць правядзення ўльтрагукавога даследавання шчытападобнай залозы, у многіх даступнае гарманальнае даследаванне тыроіднага статусу, на абласным узроўні — біяпсія, сцынтыграфія, а ў Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння могуць быць выкананы ўсе неабходныя даследаванні ў цяжкіх для дыягностыкі выпадках.

Абавязкова рэкамендуецца абследаванне дзецям, жанчынам, якія плануюць цяжарнасць, і цяжарным. Вузлавая паталогія бывае ў тым ліку ў пажылых, якія не супраць часам самастойна палячыцца ёдавымі прэпаратамі. Аднак рабіць гэта ні ў якім разе нельга! Вузлы тады пачынаюць працаваць больш актыўна, чым сама залоза, узнікае тырэатаксікоз, які вельмі цяжка лечыцца з узростам.

Калі раптам выяўлены вузел, не варта панікаваць. Далёка не ўсе вузлы трэба аперыраваць. Большасць паталогій шчытападобнай залозы лечыцца медыкаментозна. У Брэсцкай вобласці, напрыклад, укараняецца ўжо эндаскапічны метад хірургічнага лячэння дабраякаснай вузлавой паталогіі шчытападобнай залозы — ён мае добры касметалагічны эфект, дазваляе не мець рубцоў на шыі, адзначае **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Вольга САЛКО.**

Аперацыі праводзяцца на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Пры неабходнасці пацыента накіроўваюць у Рэспубліканскі цэнтр пухлін шчытападобнай залозы, размешчаны на базе Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера, або ў аддзяленне эндакрыннай хірургіі РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. Пацыенты з дыфузным таксічным валляком атрымліваюць лячэнне радыеактыўным ёдам у дзвюх установах — Мінскім гарадскім онкадыспансеры і Гомельскім абласным клінічным анкалагічным дыспансеры.

Асноўныя праблемы са шчытападобнай залозай звязаны з дэфіцытам або лішкам ёду ў арганізме, а таму важна наладзіць адпаведным чынам харчаванне. У першую чаргу ўжываць морапрадукты, марскую капусту, наогул, гатовыя прадукты айчыннай вытворчасці — усе яны выпускаюцца з ёдаванай соллю. З 2000-х у Беларусі аднавілася работа па ліквідацыі дэфіцыту ёду з выкарыстаннем найбольш эфектыўных метадаў масавай прафілактыкі. Паводле ацэнкі міжнародных экспертаў, ёдаваная соль мае значныя перавагі для такога кшталту прафілактыкі, бо практычна ўсе выкарыстоўваюць соль рэгулярна і прыкладна ў адной і той жа колькасці. Якасць такога прадукту лёгка кантраляваць на ўсіх этапах вытворчасці і паставак, продажу і спажывання. Даступнасць ёдаванай солі дазволіла нам усім атрымліваць з ежай дастатковую колькасць гэтага элементу. І гэта прывяло да змяншэння колькасці новых выпадкаў і вузлавога, і эндэмічнага валляку. Аднак колькасць пацыентаў з набытым гіпатырэозам вырасла за 2000—2015 гады больш як у сем разоў. Адзначаўся і рост у два разы захворванасці на аўтаімунны тыраідыт.

— Аўтаімунныя захворванні шчытападобнай залозы маюць шмат прычын, пачынаючы ад уздзеяння шкоднага навакольля і заканчваючы ўжываннем ежы з вялікай колькасцю нітратаў, — кажа Вольга Салко. — Для таго каб выявіць паталогію як мага раней, неабходна абследавацца і быць уважлівымі да свайго самаадчування. Стан здароўя залозы можа абумовіць праблемы з сардэчным рытмам, выклікаць мігальную арытмію, перашкаджае дабівацца аптымальных лічбаў ціску пры артэрыяльнай гіпертэнзіі. Раздражняльнасць, плаксівасць, санлівасць, патлівасць таксама павінны насцярожыць

■

Наша краіна адносіцца да эндэмічнай зоны па дэфіцыце ёду, таму ў нас заўсёды асаблівая ўвага ўдзялялася праблеме паталогіі шчытападобнай залозы, асабліва эндэмічнаму валляку. Найбольш актуальнай розная паталогія шчытападобнай залозы стала пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, калі было праведзена вельмі шмат скрынінгавых даследаванняў па выяўленні захворванняў гэтага органа, у тым ліку раку.

■ Вонкавы выгляд

РАЗ ЗМОРШЧЫНКА, ДВА ЗМОРШЧЫНКА…

Некалькі спосабаў перамагчы першыя прыкметы завядання скуры

Пасля нашага 30-годдзя сінтэз калагену зніжаецца на 1 працэнт у год. Скура губляе пругкасць, пагаршаецца колер твару, тонус мышцаў, утвараюцца першыя зморшчыны. Пасля 40 гадоў усё гэта працягвае нарастаць, скура абязводжваецца, з'яўляюцца «гусіныя лапкі» каля вачэй, сасудзістыя зорачкі, купероз, павялічваецца глыбіня насагубнай складкі, на верхняй губе могуць расці валаскі. Пасля 50 скура станчаецца, становіцца ўсё больш сухой, абвіслай, са старэчымі пігментнымі плямкамі, ёсць зморшчыны, складкі ды «мяшкі» пад вачыма. Старэе твар ва ўсіх па-рознаму — усё залежыць ад тыпу скуры, целаскладу, формы твару, стану здароўя.

— Заўчаснае старэнне скуры твару адбываецца з-за дрэннай экалогіі. Забруджанае, недастаткова вільготнае паветра, вецер спрыяюць закупорванню пор, запаленню, парушэнню абмену рэчываў, — расказвае **ўрач-дэрматавенералаг амбулаторна-дэрматавенералагічнага аддзялення №3 Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Кацярына ГАПАНОВІЧ.** — Ад дэфіцыту вільгаці мяняецца структура скуры, а ліквідаваць яго з дапамогай звычайнага піцця немагчыма — неабходны касметычныя сродкі з малекуламі вады.

Як падоўжыць маладосць?

❍ Абараняйцеся ад сонечных промняў з дапамогай капелюша, касметыкі з фільтрамі, сонцаахоўных акуляраў.

❍ Не курыце і не злоўжывайце алкаголем.

❍ Ужывайце больш агародніны, фруктаў, морапрадуктаў, менш цукру, простых вугляводаў і халестэрыну.

❍ Трымайце вагу на адным узроўні, не дапускайце рэзкіх хістанняў.

❍ Спіце не менш сямі гадзін.

❍ Пазбягайце стрэсаў.

❍ Прымайце вітамінныя комплексы (пасля наведвання ўрача).

❍ Умерана займайцеся спортам.

❍ Рабіце гімнастыку і масаж твару.

Касметолаг здольны падабраць догляд з улікам тыпу старэння скуры

З мэтай амаладжэння могуць прымяняцца…

…ін'екцыі ботаксу — эфектыўная і бяспечная працэдура, здольная выдаліць мімічныя зморшчыны на лбе, пераноссі, у кутках вачэй і над губамі.

…мезатэрапія — розныя сумесі і экстракты, якія падбіраюцца індывідуальна і ўводзяцца ўнутр скуры, што дазваляе змагацца з пігментнымі плямамі, зморшчынамі, ацёчнасцю, рубцамі і застойнымі плямамі ад куперозу і прышчоў.

…біярэвіталізацыя — заснавана на ін'екцыях прэпаратаў на аснове гілаўронавай кіслаты, што аднаўляе пругкасць, водны баланс, выпрацоўку калагену.

…тэрмаліфтынг — выкарыстанне радыечастотных выпраменьванняў, якія ўздзейнічаюць на глыбокія слаі эпідэрмісу (для тых, хто хоча абысціся без уколаў, можа прымяняцца пасля 35 гадоў).

…фракцыйнае лазернае амаладжэнне — працэдура досыць новая, дапамагае значна палепшыць вонкавы выгляд скуры, падцягнуць скуру, палепшыць яе тэкстуру.

…фотаамаладжэнне, выкарыстанне якога забяспечвае станоўчыя змены літаральна пасля першай працэдуры. Пры сістэматычным прымяненні можна атрымаць працяглы, устойлівы вынік.

Наогул, у арсенале касметолага шмат чаго цікавага і дзейснага

■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск №48 (395)

ЭСТЭТЫКА ПАРАДОКСУ

З якімі пачуццямі мы адзначаем Дзень беларускага кіно

З пераменным поспехам, але мы да гэтага прыйшлі: 17 снежня беларускаму кіно спаўняецца 93 гады, і, як любая спецыяльная дата, названае свята падштурхоўвае да падвядзення вынікаў. Калі справа кінематаграфістаў у гэты момант — адзначаць дзень нараджэння айчыннага кінематографа, наша справа — рабіць высновы. Мы азірнуліся на мінулы год і знайшлі ў ім шэраг цікавых, паказальных, сімптаматычных рэчаў, якія варта было б згадаць. Значыць, па парадку.

Наша заўтра

Ад прыватнага да агульнага: размовай пра фільм, які варта лічыць адным з самых паказальных у сучасным айчынным кіно, можна апісаць беларускі кінематограф у цэлым. Дэбютная поўнаметражная карціна «Заўтра» невядомага аўтара Юліі Шатун была знята без бюджэту, а значыць, без прафесійнай каманды, вядомых акцёраў і дарагога post-production. На сёлетнім кінафестывалі «Лістапад» яна была ўключана не толькі ў Нацыянальны конкурс, але і ў конкурс «Маладосць на маршы», куды беларускія фільмы раней не траплялі. І не дарэмна: стужка пра інтэлігентную сям'ю, што жыве ў правінцыяльным горадзе, перабіваецца амаль выпадковымі заробкамі і камунікуе між сабой ужо толькі аўтаматычна, аказалася трапным і асэнсаваным партрэтам рэчаіснасці, якая нас з вамі акружае. У сучасным беларускім кінакантэнце фільм становіцца на асаблівае месца: калі аўтары нацыянальнай кінастудыі не могуць справіцца з дынамічнымі жанрамі, за якія саманадзейна бяруцца, то безбюджэтны фільм Юліі Шатун прадстаўляе сабой цалкам арганічную канструкцыю; калі «Беларусьфільм» вылучаецца дзіўнай тэматыкай ігравога кіно, то «Заўтра» бездакорнае ў сваёй сувязі з актуальнай рэальнасцю; калі фільмы кінастудыі ідуць за пэўным шаблонам, Юлія Шатун здымае сваю карціну згодна з уласнай узважанай, прадуманай канцэпцыяй, дзе і візуал, і спосаб здымак працуюць на сэнс. Ні адзін фільм нацыянальнай кінастудыі — асноўнага паглынальніка прызначаных для кіно дзяржаўных сродкаў — не параўнаецца з непрафесійнай і безбюджэтнай работай Юліі Шатун, і ў гэтым знак сучаснага беларускага кіно. Стужка «Заўтра» такая, вядома, не адна: у беларускай кінасферы сёння з'яўляецца даволі безбюджэтных, малабюджэтных карцін альбо фільмаў, створаных без удзелу дзяржаўных грошай. Звычайна гэта добрае кіно. І перспектывы хаваюцца менавіта тут.

«Цар гары» Андрэя КУЦІЛЫ.

Здалі

У лістападзе завяршылася шматгадовая рэканструкцыя, якая выццам зрабіла «Беларусьфільм» «кінастудыяй еўрапейскага ўзроўню». Раней кінастудыя магла апраўдваць свае няўдачы зацяжным рамонтам сцен, а цяпер, калі што, такога апраўдання не будзе. Паўстаюць пытанні, дзеля чаго гэта ўсё будзе працаваць і ці прыйшоў пасля завяршэння рэканструкцыі залаты век беларускага кіно? Мне падалося сімвалічным, што падчас экскурсіі, якую дырэктар кінастудыі Ігар Паршнеў яшчэ ў лістападзе правёў для журналістаў, гаворка ішла аб выкарыстанні гатовых пляцовак, але амаль што толькі расійскімі здымачнымі групамі: у адным з павільёнаў мы знайшлі дэкарацыі для серыяла «Вяртанне Мухтара-2», а з вуснаў экскурсавода ўвесь час чулі пра дамоўленасць з рэжысёрам Аляксеем Мурадавым, які рыхтуецца да здымак на «Беларусьфільме» серыяла пра Чарнобыль. Безумоўна, на кінастудыі здымаліся, здымаюцца і будуць здымацца беларускія фільмы. Але ў кантэксце беларусьфільмаўскага курса на серыялы, баевікі і супрацоўніцтва з замежнымі (пераважна расійскімі) здымачнымі групамі заклапочанасць будучыняй беларускага кінематографа недзе згубілася. А гэта значыць, што як да завяршэння рэканструкцыі, так і пасля «Беларусьфільм» не абяцае хоць нейкага ўнёску ў развіццё беларускага ігравога кіно і яго прадстаўленасць на міжнародных кінафестывалях.

«Заўтра» Юліі ШАТУН.

Дакументалістыка ў незалежных руках

Мы ўспамінаем карціны мінулага года і бачым, што самыя вартыя і смелыя дакументальныя праекты былі створаны не на кінастудыі, што яшчэ нядаўна магла выстаўляць неігравое кіно ў якасці козыра, а незалежнымі аўтарамі. Адзін з найярчэйшых беларускіх дакументалістаў Андрэй Куціла прадставіў фільм «Цар гары», галоўным героем якога з'яўляецца Сямён Дзьячок, што разам з сям'ёй пераехаў у вёску, стаў весці відэаблог, а яго ідэя фермерства пацярпела фіяска праз засілле пабораў і штрафаў. Вольга Дашук па аналогіі з карцінай Кшыштафа Кеслёўскага «Гаваркія галовы» стварыла фільм «Партрэт», дзе дала беларусам — ад немаўляці да старога мужчыны, ад звычайных людзей да вядомых персон — адказаць на пытанні пра шчасце, мары і самаідэнтыфікацыю. Фільм Настассі Мірашнічэнкі «Дэбют» пра тэатр у жаночай папраўчай калоніі сёлета быў паказаны на найпрэстыжнейшым у сферы дакументалістыкі кінафестывалі IDFA ў Амстэрдаме. Нарэшце, карціна «Вакол Беларусі на веласіпедах з маторамі», створаная непрафесійнымі кіношнікамі, але дапытлівымі і разумнымі хлопцамі Барысам Нікалайчыкам і Раманам Свечнікавым, паказала, як з пэўным хаосам у аператарскай рабоце і мантажы можна стварыць багатую на эмоцыі карціну пра Беларусь. Ва ўсіх фільмах бачыцца водгук нашага агульнага навакольля, а гэта надзвычай важна — мець магчымасць аналізаваць рэчаіснасць праз мастацтва. Зрабіць гэта мы з большай верагоднасцю можам праз менавіта незалежнае кіно.

Заканадаўства

Свет не стаіць на месцы, таму прыйшоў час фарміраваць новы законапраект, які датычыўся бы кінематографа. І сапраўды, у кастрычніку на грамадскае абмеркаванне быў вынесены распрацаваны Міністэрствам культуры праект указа Прэзідэнта «Аб мерах па стымуляванні развіцця кінематографа». Праўда, як аказалася, падпарадкоўваецца ён не столькі неабходнасці ўлічваць імклівае развіццё, выклікі і магчымасці часу, колькі жаданню сканцэнтраваць яшчэ большую ўвагу на развіцці «Беларусьфільма», што прамым тэкстам пацвердзіла Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Тым часам змены ў гэтай сферы сапраўды патрэбныя, і пакуль кінасупольнасць кажа пра стварэнне кінацэнтра, еўрапейскія фонды, да якіх варта было б далучыцца, фінансаванне ўдзелу маладых кінематаграфістаў у міжнародных пітчынгах, — новы законапраект кіруецца ўчарашнім днём і інтарэсамі архаічнай сістэмы «Беларусьфільма». Усё гэта сведчыць пра тое, што структуры, якія адказваюць за развіццё кінематографа і яго фінансаванне, больш жывуць мінулым, чым сённяшнім. А калі тут няма адпаведнага мыслення, то маладым і перспектыўным аўтарам яшчэ доўга прыйдзецца перабівацца ўласнымі высілкамі і безбюджэтнымі фільмамі.

Уласная філасофія

Шкада чарговы раз прызнаваць, але беларускае кіно ўсё яшчэ знаходзіцца ў крызісе, хоць прасветы ў выглядзе незалежных аўтараў, рэдкіх фільмаў і нават уласнай філасофіі здараюцца. Апошняе звязана з імем самага неадназначнага рэжысёра нашай краіны Андрэя Кудзіненкі. У свой час на тэрміне Міхаіла Бахціна «хронотоп» ён пабудаваў уласную канцэпцыю «хранатопі», у якой трэба памерці, каб нарадзіцца ў новай якасці, і звязаў гэта з метадам стварэння кіно. Ён стаў куратарам кінаінтэнсіваў, дзе людзі, што прагнуць ствараць фільмы, павінны абнуліцца і ў прапанаваных умовах літаральна за некалькі дзён выдаць кароткаметражку. Адметна, што так званых акцый адбылося не дзве і не тры: справа Кудзіненкі аказалася моцнай, і якраз у гэтым месяцы мы пабывалі на прэзентацыі ўжо восьмага альманаха, які сабраў фільмы, знятыя падчас летняга кіналагера ў вёсцы Каптаруны. З'яўленне аўтарскага паняцця «хранатопі» і адпаведнага метаду стварэння кіно — сімптаматычная з'ява. Нам варта было чакаць нечага падобнага — канцэптуальнага і таннага — у сітуацыі, якая склалася ў беларускім кіно. Калі няма ні грошай, ні магчымасці прасуноць свае праекты ў пошуках фінансавання, ні прадзюсарскага інстытута, можна проста абнуліцца. Аказалася, ахвотных гэта зрабіць пад кіраўніцтвам Андрэя Кудзіненкі — даволі шмат.

«Вакол Беларусі на веласіпедах з маторамі» Барыса НІКАЛАЙЧЫКА.

«Гэта некарэктнае пытанне»

Сучасны беларускі кінематограф адзначаецца пэўнымі нотамі парадоксу, а часам і абсурду. Гэта праяўляецца падчас фарміравання тэм, з якімі можна падавацца на рэспубліканскі адкрыты конкурс кінапраектаў. У механізме работы камісіі, якая адбірае праекты для фінансавання. У мэтах распрацаванага праекта ўказа «Аб мерах па стымуляванні развіцця кінематографа». У імкненні «Беларусьфільма» здымаць баевікі, улічваючы, што ніводнага ўдалага за апошні час ён не стварыў. У кіраванні словамі «ідэалогія», «зарабляць», «прадаваць на расійскі тэлеэкран» і ігнараванні паняццяў «мова кіно», «аўтарскае кіно» і «міжнародныя кінафестывалі». У тым, што ў кінафестывалю «Лістапад» у гэтым годзе быў самы маленькі бюджэт за восем апошніх гадоў. У тым, што відавочныя поспехі незалежных аўтараў рэдка заўважаюцца ўладнымі структурамі і «студыяй еўрапейскага ўзроўню» «Беларусьфільмам». Але квінтэсэнцыяй абсурду будзем лічыць выказванне, якое мы пачулі на прэзентацыі фільма нацыянальнай кінастудыі «Сляды на вадзе». Гісторыя пра барацьбу з бандфарміраваннямі ў пасляваенныя часы атрымала фінансаванне праз рэспубліканскі конкурс, гэта значыць стваралася за кошт дзяржаўнага бюджэту. Так атрымалася, што гэты фільм аказаўся адзінай ігравой карцінай «Беларусьфільма» за 2016 год. Дык вось, калі журналіст запытаўся ў дырэктара кінастудыі Ігара Поршнева пра бюджэт знятага за кошт падаткаплацельшчыкаў фільма, ён адказаў: «Гэта некарэктнае пытанне».

«Партрэт» Вольгі ДАШУК.

Мы ўжо добра знаёмыя з гэтай эстэтыкай парадоксу.

P. S. *Сачыць за беларускім кіно, праўда, вельмі цікава. Тут абсурд, а там геройскі энтузіязм і здольнасць да аўтарскага аналізу рэчаіснасці. Шкада, афіцыйныя структуры маглі б закласці моцны падмурак для беларускага кіно, але кіно ў іх уяўленні часцей — толькі інструмент. Затое пачуццё (ці хоць бы надзея), што найлепшае — яшчэ наперадзе, аказваецца стойкім нават перад мадэляваннем найгоршых сцэнарыяў. З 93-годдзем беларускага кіно!*

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Нотны радок

ПАД ФАНФАРЫ

У гэтыя дні віншаванні прымае Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. Але папраўдзе віншаваць трэба ўсіх тых, хто любіць хадзіць на канцэрты: да гэтага юбілею прымеркаваны шэраг выступленняў замежных і айчынных выдатных музыкантаў. Фактычна ўся снежаньская афіша музычных імпрэз натхнёная гэтым святам. Яго могуць лічыць сваім выкладчыкі і студэнты, выпускнікі і партнёры, якіх вельмі шмат у акадэміі музыкі ў розных кутках свету. І нават тыя, хто яшчэ толькі марыць прыйсці ў гэтыя сцены ў якасці навучэнца. З думкай пра іх існуе і музычная навука, таму падчас Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гэтыя дні абмяркоўвалі актуальную тэму «Прафесійная музычная адукацыя на сучасным этапе: традыцыі і навацыі. Да 85-годдзя Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі».

Рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, член Савета Рэспублікі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Кацярына ДУЛАВА ўдакладняе:

— Архіўныя матэрыялы даюць інфармацыю пра больш ранні перыяд утварэння кансерваторыі: указ, датаваны 1925 годам, сведчыў, што было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. А ўжо сам факт адкрыцця і пачатак функцыянавання ўстановы датуецца 1932 годам. Мяркую, што яшчэ да пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя было ўяўленне аб неабходнасці стварэння сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі.

Зараз мы можам доказна гаварыць пра тое, наколькі разнастайным і цікавым было культурнае і тэатральнае жыццё ў нашай краіне ў розныя перыяды яе гісторыі: у ВКЛ ці Рэчы Паспалітай, падчас знаходжання ў межах Расійскай імперыі, у гады існавання сучаснай беларускай дзяржавы. І раней былі ўстановы адукацыі, якія адначасова выконвалі функцыю культурных цэнтраў: калегіумы, музычныя тэхнікумы ў Віцебску, Мінску, Магілёве. Гэта асобная тэма: наяўнасць падрыхтоўчага этапу, стварэнне музычнага асяроддзя, таго ж Беларускага музычнага таварыства. Адметны сам факт, што ў няпростыя часы, калі толькі ішло станаўленне эканомікі новай дзяржавы, думкі, у тым ліку дзяржаўных людзей, былі звязаны з культурай.

...Важнай акалічнасцю ў гэтым працэсе стала запрашэнне выдатных дзеячаў савецкай — расійскай — музычнай культуры і адукацыі для таго, каб выхоўваць нашы нацыянальныя кадры. Сёння мы ганарымся, што многія з вядучых прафесараў Беларускай акадэміі музыкі былі першымі вучнямі выдатных дзеячаў Санкт-Пецярбургскай, Маскоўскай кансерваторый, такіх, як вучань Рымскага-Корсакава Васіль Залатароў. Пазней з'явілася практыка навучання найлепшых выпускнікоў нашай школы пры кансерваторыі ў вядучых ВНУ Расіі, каб яны потым вярталіся і выхоўвалі наступнае пакаленне беларускіх музыкантаў.

Падыход быў акадэмічны, але, з другога боку, у нас адкрыўся адзін з вядучых кірункаў — факультэт народных інструментаў: ён развіваецца, і цікавасць студэнтаў да спецыяльнасцяў, звязаных з народным выкананнем, не згасае. Тады ж прыходзілі працаваць выдатныя майстры, самародкі, як тыя ж Жыновіч ці Жыхараў...

У цяперашні час па кожнай спецыяльнасці ў нас ёсць не проста майстар, а яго творчая школа. Гэта самы лепшы варыянт развіцця выканальніцкага кірунку, калі ёсць выдатны педагог (напрыклад, піяніст, скрыпач), які вядзе сваіх вучняў і перадае ім майстэрства: як здабываць гук, як інтэрпрэтаваць твор або той ці іншы стылявы кірунак. Таму нармальным з'яўляецца пытанне: «У каго ты вучыўся?»... Адзначаю піетэт, што існуе ў нашых выхаванцаў у адносінах да педагога, які падчас вучобы становіцца блізкім чалавекам...

Але за апошнія 3—4 гады больш за 20 чалавек з ліку нашых выпускнікоў працаўладкаваны ў Акадэміі музыкі. Ужо можна казаць, што мы фарміруем уласныя адукацыйныя традыцыі.

Сёння з задавальненнем магу гаварыць пра фартэпіянную школу, якую фарміруюць Ігар Алоўнікаў, Юрый Гільдзюк, Уладзімір Дулаў, Уладзімір Няхаенка. У нас працуе Ніна Шарубіна, якая вядзе вакальную справу. Ёсць школа харавога майстэрства, якую стварыў Віктар Роўда і традыцыі якой працягвае загадчык кафедры харавога дырыжыравання Інэса Бадзяка, школа выканання на духавых інструментах на чале з прафесарамі М. М. Волкавым, У. П. Скарахадавым, Б. У. Нічковым, школа спеваў, найстарэйшым прадстаўніком якой з'яўляецца народная артыстка СССР, прафесар Т. М. Ніжнікава, школа выкананне на беларускіх цымбалах, заснаваная І. І. Жыновічам, традыцыі якога плённа развівае сёння народны артыст Беларусі, прафесар Я. П. Гладкоў, і многія іншыя.

Для аматараў музыкі цікавы сённяшні дзень айчыннага мастацтва, тыя, хто прыйдзе на змену майстрам. Але тут майстэрства набываюць нават у маладосці, сведчанне гэтага — юбілейная афіша, сярод імёнаў — лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Нашы музыканты. Зоркі!..

Поўную версію інтэрв'ю з Кацярынай Дулавай чытайце ў газеце «ЛіМ».

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Ёсць нагода

ФАРБЫ Ў ТАНЦАХ

Так, сучаснасць мае свае абліччы... Але калі гучыць «Лявоніха», калі яе танцуюць з імпэтам, міжволі пачынаеш прытопваць, не думаючы, што сядзіш у глядзельнай зале, а яны — артысты — далёка на сцэне. Ці вось яшчэ «Рэпка» — так бы і дапамог выцягнуць...

У рамках юбілейнага тура па Беларусі і па Еўропе ў Палацы Рэспублікі адбыўся канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні «Белыя росы». Такім чынам заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, які існуе ў Гродне, адзначыў у сталіцы сваё 30-годдзе з праграмай «Фарбы свету». Але ж у гэтым свеце ёсць месца Беларусі — прыкметнае і ўтульнае. Пра што і сведчыць ансамбль, які мае свой вельмі пазнавальны стыль. Каларытныя танцы, відаць, прыцягваюць увагу замежнікаў. Напрыклад, у 1992 годзе ансамбль «Белыя росы» выступаў у Давосе на эканамічным форуме. І нездарма гэты калектыў прадстаўляе нашу дзяржаву падчас Дзён культуры ў розных краінах — ад Кітая да Іспаніі. Іспанская прэса нават прызнавала ансамбль з Беларусі найлепшым калектывам, які гастралюе. Што праўда: большую частку свайго часу ён праводзіць на канцэртных пляцоўках Еўропы, паказвае аблічча Беларусі, у прыватнасці заходняй яе часткі: бабуліны песні і танцы, фальклор гэтага асаблівага рэгіёна (ствараюцца яго сучасныя перапрацоўкі) падкрэсліваюць адметнасць культуры памежнай тэрыторыі.

Мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар — заслужаная артыстка Беларусі Вера Войнава, якая працуе ў «Белых росах» з 1987 года. Яна сама ставіць танцы — нашы. А вось на пастаноўкі танцаў народаў свету запрашаюць найлепшых майстроў тых краін — яны ведаюць свой каларыт, могуць яго перадаць лепш. Што і было важна падчас падрыхтоўкі праграмы «Фарбы свету»: танцы нараджаюцца з ладу жыцця і характару народа.

Каб перадаць гэта — сыграць ды станцаваць — трэба быць прафесіяналамі. Сёння ў ансамблі ўсяго каля 90 чалавек: музычная група, хор, танцавальная група, усе прафесійныя артысты. Майстэрства заўважана і адзначана: заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Белыя росы» з'яўляецца лаўрэатам Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны.

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Выстаўка

ГРАФІКА+

Найлепшае з 2017-га і яшчэ крыху: у Палацы мастацтва прадстаўлены праект «Графіка года»

Малюнак, акварэль, эстамп, лічбавыя тэхналогіі — творцы спрабавалі зачапіць тэхнікай, ідэяй, філасофскім падыходам і індывідуальнасцю. Паколькі ў выставачнай прасторы пад праект была выдзелена невялікая тэрыторыя, патрабаванні да твораў аказаліся сур'ёзныя. І прызоў арганізатары вылучылі толькі два — за арыгінальную графіку, дзе прадстаўлены малюнак, акварэль і змешаныя тэхнікі, і за друкаваную, якую можна дубліраваць (у гэтую ж намінацыю ўваходзіў лічбавы друк).

Алесь НЕКРАШЭВІЧ, «Тэрмінатар».

— Хацелася паказаць самае лепшае з графікі, акрамя таго мы выставілі некалькі мастакоў з жывапіснага цэха — Зою Літвінаву, Зою Луцэвіч і Святлану Каткову, — расказвае **куратар выстаўкі старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Большасць работ датаваныя 2017 годам, хоць мы прынялі і некалькі твораў, зробленых раней, якія, тым не менш, у конкурсе «Графіка года» не разглядаліся.

У кожнай намінацыі было па тры прэтэндэнты. Пераможцамі ў намінацыі «Тыражная графіка» сталі Андрэй Савіч і Андрэй Кошалеў. Мастакі прадставілі праект «Дзень усіх святых. Карта для гульні». Дыплом у намінацыі «Тыражная графіка» за дзве працы, аб'яднаныя назвай «Архітэктура», атрымаў Андрэй Басалыга. Трэцім намінантам стала маладая мастачка Аліна Прастак, якая прадставіла лінагравюру. У намінацыі «Арыгінальная графіка» пераможцам стаў мастак-манументаліст Аляксандр Некрашэвіч, які прадставіў цікавы па стылізацыі твор «Тэрмінатар».

Адчуваецца, як розныя пакаленні творцаў захапіліся адной ідэяй і імкнуліся найбольш дакладна і зразумела данесці яе да гледача.

— Паколькі ў выстаўцы бяруць удзел прадстаўнікі маладога пакалення, можна гаварыць пра давер да іх, — падкрэслівае Андрэй Басалыга. — У маладога аўтара з'яўляецца стымул і цікавасць выстаўляцца разам з такімі мэтрамі, як, напрыклад, Зоя Літвінава, — гэта ж, сапраўды, дасягненне. Але тут мне не хочацца дзяліць мастакоў на пакаленні. У дадзеным выпадку вучацца не толькі маладыя, але і мэтры графікі: спрабуюць зразумець, чым жыве моладзь, як адчувае жыццё. Хоць наша школа моцная, мы не павінны замыкацца толькі ў яе рамках. Павінны быць і погляды ў сусветную прастору графічнага мастацтва. Нашай школе трэба не баяцца мяняцца, а спакойна ўспрымаць такую з'яву, як трансфармацыя.

Вікторыя АСКЕРА

ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 10.01.2018 г. повторные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ЧПУП «Молочно-товарная ферма «Сырмеж» (продавец)

Лот №	1	2	3	4
Сведения о предмете электронных торгов	Капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома), общ. площадь 72,7 кв. м, отопление, водопровод, канализация, электроснабжение, 2010 год постр., земельный участок №624081406801000039 (площадь – 0,1428 га)	Капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома), общ. площадь 73,9 кв. м, отопление, водопровод, канализация, электроснабжение, 2010 год постр., земельный участок №624081406801000041 (площадь – 0,1505 га)	Капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома), общ. площадь 72,3 кв. м, отопление, водопровод, канализация, электроснабжение, 2010 год постр., земельный участок №624081406801000044 (площадь – 0,1509 га)	Капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома), общая площадь застройки 66,0 кв. м, отопление, водопровод, канализация, электроснабжение, 2010 год постр. , земельный участок №624081406801000040 (площадь – 0,1414 га)
Начальная цена предмета торгов	18 486 руб. 27 коп., без НДС	18 392 руб. 05 коп., без НДС	19 139 руб. 83 коп., без НДС	16 245 руб. 51 коп., без НДС
Шаг аукциона	5% – 924 руб. 31 коп.	5% – 919 руб. 60 коп.	5% – 956 руб. 99 коп.	5% – 812 руб. 27 коп.
Сумма задатка	10% – 1 848 руб. 62 коп.	10% – 1 839 руб. 20 коп.	10% – 1 913 руб. 98 коп.	10% – 1 624 руб. 54 коп.
Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с организацией торгов	80 руб. 00 коп.	80 руб. 00 коп.	80 руб. 00 коп.	80 руб. 00 коп.
Местонахождение предмета торгов	Минская обл., Мядельский р-н, Занарочский с/с, аг. Сырмеж, д. 56	Минская обл., Мядельский р-н, Занарочский с/с, аг. Сырмеж, д. 81	Минская обл., Мядельский р-н, Занарочский с/с, аг. Сырмеж, д. 83	Минская обл., Мядельский р-н, Занарочский с/с, аг. Сырмеж, д. 58
Р/с для перечисления суммы задатка	(IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код банка (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей, 23/3, УНП 191514793			

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 10.01.2018 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 10.01.2018 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел.: (8 029) 9826850, (8 029) 9826474, (8 029) 6703084, WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец ЧПУП «Молочно-товарная ферма «Сырмеж», в лице управляющего по банкротству ООО «Лигал Консалт», директор Кшова А. В., тел. (8 029) 7795659. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» – WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10% по каждому лоту принимаются по 08.01.2018 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»

Лот №1. **Капитальное строение с инв. №700/С-78151 (склад),** расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 261,8 кв. м, фундамент – бетонный, стены и перегородки – бетонные, металлические, крыша – шиферная, полы – бетонные.

Начальная цена продажи: 20 202,50 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 2 020,25 бел. руб.

Лот № 3. **Капитальное строение с инв. №700/С-56312 (материальный склад),** расположенное по адресу: г.Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 1564,0 кв.м; фундамент – ж/бетонный, стены– кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – рулонная.

Капитальное строение с инв. №700/С-78152 (склад), расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 7, площадь – 5,2 кв. м.

Начальная цена продажи: 82 069,60 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 8 206,96 бел. руб.

Продавец	ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1
Расчетный счет для перечисления задатка	Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X
Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион проводится 27 декабря 2017 года в 13.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 26 декабря 2017 года до 15.00
Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества	В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.08.17, 03.10.17 и 21.11.17

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14; 8 029 624-26-25; 8 044 738-18-99

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, тел.: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01

Лот №1 – недвижимое имущество по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 9А

Здание склада с гаражом (литер А 2/кп)	Здание многофункциональное	476 кв. м	500/С-31450

Составные части и принадлежности: площадка из плит дорожного покрытия

Оборудование	Неисправная кран-балка электрическая, г/п 2 т, инв. №40
Обременя	Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20% – **180 860,00 бел. руб. (BYN)**
Шаг аукциона – **9 043,00 бел. руб. (BYN)**

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375 29 654-92-93

Лот №2 – изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, пом. 5

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Административное помещение (административное помещение)	279,7 кв. м	500/D-7076983

Обременения	Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20% – **153 867,24 белорусских рублей (BYN)**
Шаг аукциона – **7 693,36 белорусских рублей (BYN)**

Лот №3 – Изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, пом. 6

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Административное помещение (административное помещение)	521,6 кв. м	500/D-7076984

С перечнем иного имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Условия аукциона: Покупатель обязан предоставить Продавцу административные помещения согласно прилагаемому плану помещений в пользование, на период с момента перехода права собственности на предмет аукциона к покупателю до момента ликвидации Продавца на условиях безвозмездного пользования, за исключением случаев, предусмотренных законодательством Республики Беларусь. С планом помещений, подлежащих передаче Продавцу в безвозмездное пользование, можно ознакомится на сайте Организатора торгов WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20 % – **289 257,74 бел. руб. (BYN)**
Шаг аукциона – **14 462,89 бел. руб. (BYN)**

Порядок ознакомления по лотам №№2–3	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственное лицо: Журавская Валентина Михайловна, инженер ППР ПТО, контактный тел. +375 29 385-06-53, Макаревич Наталья Михайловна, бухгалтер 1-й категории, тел. 8 029 608-36-80

Лот №4

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования и сооружений, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254

Наименование (Назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Здание АБК с цехом по производству металлоконструкций (здание многофункциональное)	3030,0 кв. м	350/С-88086
Составные части и принадлежности: пристройка, тамбур, беседка, забор, ворота (2 шт.), отмостка, проезжая часть, бордюр к проезжей части, бетонная площадка, тротуар		
Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 31.05.2018 г.		
Здание не отапливаемого материального склада (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)	947,6 кв. м	350/С-88082
Составные части и принадлежности: пристройка, пандус, сарай		
Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 02.01.2019 г.		
Здание мастерской техобслуживания (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)	764,5 кв. м	350/С-88090
Составные части и принадлежности: пристройка, сарай		
Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 31.05.2018 г.		
Здание проходной (здание неустановленного назначения)	8,7 кв. м	350/С-88091
Канализационно-насосная станция (здание специализированное коммунального хозяйства)	31,9 кв. м	350/С-88092
Составные части и принадлежности: подвал, крыльца		
Здание трансформаторной подстанции (здание специализированное энергетики)	40,1 кв. м	350/С-88094
Составные части и принадлежности: отмостка		
Здание теплопункта (здание специализированное энергетики)	42,9 кв. м	350/С-88096
Составные части и принадлежности: отмостка		
Ограничение (обременение): договор аренды открытой площадки для стоянки автомобильной техники до 02.01.2019 г.		

Сооружения, входящие в состав лота

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Навес для хранения кислородных баллонов (17, 5 кв. м)	0006970	Тепловые сети (200 м)	17
Навес для хранения газовых баллонов (28,2 кв. м)	0012717	Канализационные сети (200 м)	150000
Металлическая эстакада №1 (1,4 т)	0014321	Водопроводные сети (5 км)	16
Металлическая эстакада №2 (1,9 т)	0014322	Телефонный кабель (4 км)	13
Очистные сооружения объемом отстойника – 380 куб. м	9	Низко-высоковольтные сети (АВВГ 655 п. м и АВВГ 80 п. м)	14
Вышка осветительная (25,0 п. м)	150155	Телефонизационные сети	8
Открытый склад металла (склад №1 – подкрановые пути 187 п. м, ж/б площадки 5425 кв. м; склад №2 – крановая эстакада, бетонное покрытие 864 кв. м)	7	Кабель марка кабеля ААШВ 3*120 длина 1,62 км	133000
Кабель 10 кВт АСБ-3 *185 L=1,045 км	132000	Кабель 6 кВт 3*120, L=0,6 км	131000
Многолетние насаждения в количестве 111 ед., инв. №150119 – 150122			

Оборудование, входящее в состав лота

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Кран подвесной Эл-32	729	Кран козловой консольный 20 тн.	920
Кран подвесной Эл-2	728	Электрическая кран-балка подвесная	706
Кран-балка	622		

Материалы, входящие в состав лота: железобетонные конструкции (340 тн)

Сведения о земельном участке	Земельный участок общ. пл. 3,7412 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации производственной базы

Начальная цена с НДС 20% – **443 520,22 бел. руб. (BYN)**
Шаг аукциона – **22 176,01 бел. руб. (BYN)**

Порядок ознакомления: ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственные лица: Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка СУ-118, контактный телефон +375 29 603 49 02

Лот №5 – Изолированное помещение по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 120А-5

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Изолированное помещение № 5 (административное помещение)	116,9 кв. м	100/D-85374

С перечнем иного имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20% – **107 134,33 бел. руб. (BYN)**
Шаг аукциона – **5 356,72 бел. руб. (BYN)**

Лот №6 – Изолированное помещение по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 120А-2

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Изолированное помещение №2 (административное помещение)	50,2 кв. м	100/D-85371

С перечнем иного имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Условия аукциона: Покупатель обязан предоставить Продавцу административные помещения согласно прилагаемому плану помещений в пользование, на период с момента перехода права собственности на предмет аукциона к покупателю до момента ликвидации Продавца на условиях безвозмездного пользования, за исключением случаев, предусмотренных законодательством Республики Беларусь. С планом помещений, подлежащих передаче Продавцу в безвозмездное пользование, можно ознакомится на сайте Организатора торгов WWW.CPO.BY

Начальная цена с НДС 20% – **47 723,40 бел. руб. (BYN)**
Шаг аукциона – **2 386,17 бел. руб. (BYN)**

Порядок ознакомления по лотам №№5–6:	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, директор филиала СУ-159, контактный телефон 8 029 659-25-23

Оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Гурского, 16а

№ п/п лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год выпуска	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
7	498	Станок радиально-сверлильный типа 2К550 в комплекте со столом, тисками, патроном сверлильным резьбовым, 2010 г. в.	6 492,02	324,60
8	242	Станок токарно-винторезный типа 6Б 16П	1 649,96	82,50
9	827	Подмости передвижные электрические ППЭ-1, 2010 г. в.	6 720,00	336,00
10	325	Вагон-общежитие, 1979 г. в.	720,00	36,00

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, начальник автотранспортного участка, контактный телефон +375 29 654-92-93

Транспорт и оборудование, расположенные по адресу: г. Гродно, ул. Индустриальная, 2а, в составе

11	580	Нивелир Н3, 1976 г. в.	6,96	0,35
12	595	Нивелир Н3К, 1982 г. в.	6,96	0,35
13	385	Люлька строительная ЛЭ-100*300, 1983 г.	110,40	5,52
14	699	Нивелир НВ-1, 2004 г.	9,60	0,48
15	357	Вагон-общежитие, 1981 г. в.	442,20	22,11
16	501	Станок сверлильный ИЭ-1806	432,00	21,60
17	12	Станок сверлильный настольный НС-12	95,04	4,75
18	924	Станок для холодной гибки труб	442,80	22,14
19	719	Копировальный аппарат Xerox CopyCentre C118	151,20	7,56
20	720	Печь прокалочная ЭПС-10/400СЭ	106,92	5,35
21	850	Выпрямитель для дуговой сварки ВДМ-6303С-У3	421,20	21,06
22	801	Трансформатор сварочный ТДМ 252У2	101,52	5,08
23	611	Сварочный агрегат колесный (САК), заводской №13859	777,60	38,88
24	900	Установка алмазного сверления Piranha ZIZ-230	399,60	19,98

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.30, перерыв с 12.30 до 12.45. Ответственные лица: Марчик Петр Иванович, начальник производственного участка СУ-110, контактный телефон +375 29 821-07-71, Соломов Лев Михайлович, мастер производственного участка, тел. 8 033 686-66-94

Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254 в составе

25	998	Автобус-вагон ГАЗ (GAZ)–2705 (2000 г. в.)	533,80	26,69

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00 по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка, контактный телефон +375 29 603-49-02 (Velcom)

Транспорт и оборудование, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д в составе

26	373	Подмости ПВС 12, 1979 г. в.	2 115,79	105,79
27	242	Преобразователь частоты ПЧ-4/42-200У2 (2010 г.в.) Pfaff Silberblau Германия	163,20	8,16

Оборудование, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Я. Купалы, 120/2

28	248	Станция подогрева бетона КТП-ТО 80-86 У-1, 1990 г. в.	110,00	5,50

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, директор филиала СУ-159, контактный телефон +375 29 6592523

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: по лотам №№1–6 не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. **По лотам №№7–28** не более 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении повторного аукциона опубликовано в газете «Звязда» 30.11.2017 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**28.12.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж»**
Дата, место и время окончания приема документов	**26.12.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by

КЛАКСАН

У ПОШУКАХ БУДУЧЫНІ

Галоўныя выклікі аўтамабільнага 2018 года

Адыходзячы аўтагод стаў даволі насычаным як для Беларусі, так і для свету ў цэлым. Змяніліся пакаленні дзясяткаў як бюджэтных, так і прэміяльных мадэляў, умацаваліся пазіцыі недарагіх аўтамабіляў на рынку, што зноў паказала на нізкую плацежаздольнасць пакупнікоў. Вядома, запрацаваў доўгачаканы завод «БелДжы», з'явіўся вельмі цікавы беларускі красовер — увогуле, падзеямі год дакладна не абдзелены. Затое да 2018-га ёсць некалькі пытанняў, тры самыя важныя з якіх сфармуляваў журналіст «Звязды».

Фота БЕЛТА.

Што будзе з Geely?

Напэўна, гэта адно з галоўных пытанняў у аўтасферы Беларусі. Нагадаем, што ў лістападзе бягучага года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага завода СЗАТ «БелДжы», у мерапрыемстве прыняў удзел і Аляксандр Лукашэнка. У 2018 годзе плануецца выйсці на новы ўзровень лакалізацыі дэталяў — калі зараз ён складае крыху больш за 31%, то налета павінен быць больш за 52%. Гэта значыць пярэдні і задні масты, колавыя дыскі, сістэмы ABS і ESP, а таксама сядзенні будуць беларускай зборкі, што з'яўляецца цалкам дасягальным паказчыкам, аднак далёка не самым істотным.

Плануецца, што ў 2018-м з канвеера сыдуць 25 тысяч аўтамабіляў — каля 22 тысяч пойдзе на Расію, астатнія некалькі тысяч — на продаж у Беларусі. У будучыні плануецца павялічыць магутнасці да 120 тысяч. Каб прадпрыемства было рэнтабельным, трэба прадаваць як мінімум 35 тысяч аўто за год. Больш за тое, завод будзе вырабляць аўтамабілі Geely ў асноўным для расійскага рынку. І вось тут узнікае сур'ёзнае пытанне.

А наколькі рэальныя такія планы? Бо, як вядома, попыт нараджае прапанову. Паспрабуем адсачыць па той жа Расійскай Федэрацыі. У 2017 годзе самай папулярнай кітайскай маркай стаў Lifan. Па даных аналітычнага агенцтва «Аўтастат», за мінулыя 10 месяцаў гэтага года прадалі 13 094 аўто брэнда. Другое месца — Chery, кампанія рэалізавала 4692 аўтамабілі, адставанне ад лідара проста велізарнае. А вось на трэцім месцы — якраз Geely з паказчыкам у 1872 машыны.

Больш за тое, агенцтва адзначае, што продажы Geely ў Расіі ў параўнанні з 2016 годам упалі на 53,4%. Інакш кажучы, для поўнага выканання плана беларуска-кітайскай кампаніі трэба будзе прадаць 22 тысячы аўтамабіляў у Расійскай Федэрацыі, а гэта значыць — павялічыць цяперашні паказчык больш чым у 11 разоў. Сцвярджаецца, што ў прадпрыемства ёсць дакладная бізнес-стратэгія, якая дазволіць дамагчыся гэтага. Праз 12 месяцаў убачым.

Як зменіцца беларускае заканадаўства?

Яшчэ з верасня 2017 года дэпутаты сталі абмяркоўваць магчымыя змены ў заканадаўстве ў аўтамабільнай сферы. Нагодай сталі скаргі людзей, якія сфармуляваны дастаткова выразна. Першае — ёсць аўтаўладальнікі, якія двойчы на год плацяць дарожны падатак пры праходжанні тэхагляду, напрыклад таксісты. Ёсць жа ўладальнікі новых машын, якія плацяць пошліну адзін раз на два гады, але адразу ў двухразовым памеры. Акрамя таго, усе плацяць аднолькава, нягледзячы на адлегласці, якія праязджае кіроўца. Прынцып несправядлівы.

Другая прэтэнзія заключаецца ў наступным: чалавек ездзіць на машыне, праходзіць тэхагляд і плаціць дзяржпошліну, а калі ён яе прадасць, то новы ўладальнік абавязаны будзе прайсці і выплаціць усё нанова, нават калі папярэдні зрабіў гэта за тыдзень да яго. Сутнасць у тым, што падатак прывязваецца да ўладальніка, а не да аўто.

Трагедыя каля сталічнага гандлёвага цэнтра, калі пад коламі грузавіка загінула дзіця, абвастрыла сітуацыю. Стала вядома, што той аўтамабіль ужо два гады як не праходзіў тэхагляд. Пазней з'явілася сур'ёзная лічба: амаль палова аўтамабіляў у Беларусі ездзіць без тэхагляду. Чаму? Танней заплаціць штраф, чым дзяржпошліну.

У 2018 годзе гэтае пытанне плануецца вырашыць канчаткова. Дэпутаты ўжо працуюць над праектам указа, згодна з якім дзяржпошліну могуць замяніць на транспартны збор з магчымасцю памесячнай аплаты. Чакаем.

Электрычнасць рэальна заменіць паліва?

Новы 2018 год пакажа, наколькі жыццяздольная ідэя электрамабіляў. Чаму можна зрабіць такую выснову? Ёсць галоўная прычына — сталі прыходзіць трывожныя навіны пра кампанію Tesla.

Нагадаем, гэтая арганізацыя ў 2006 годзе прадставіла аўтамабіль Model S, які карэнным чынам змяніў уяўленне аб электрамабілях. Пакуль найбуйнейшыя аўтагіганты распрацоўвалі тэхналагічныя маторы і старанна скаравалі расход паліва, Tesla паказала аўтамабіль, які ў залежнасці ад камплектацыі і электрычнага сілавога агрэгата можа праехаць на адной зарадцы больш за 600 кіламетраў. Дзівосная лічба, таксама як і паказчык разгону да 100 кіламетраў за гадзіну. У максімальнай камплектацыі такі аўтамабіль можа пераадолець гэтую адзнаку за 2,7 секунды. Такім чынам звычайны электрычны седан стаў у адзін шэраг з суперкарамі. Неймаверна!

Пасля гэтага многія аўтамабільныя карпарацыі пачалі работу над уласнымі электрамабілямі — і сёння на рынку нават ёсць з чаго выбіраць. Але праблема ў тым, што электрамабілі да гэтага часу застаюцца недаступнымі не толькі для большасці беларусаў, але і для многіх кіроўцаў у свеце, паколькі цэны вельмі высокія. Так, ёсць варыянты ад іншых кампаній — напрыклад Ford і Nissan — і кошты даволі сярэднія, але ў іх ёсць вялікая праблема — ёмістасць акумулятараў дазваляе праязджаць 100—150 кіламетраў максімум. Гэта значыць, каб даехаць з Мінска ў Брэст, трэба зарадзіць аўто тры разы — каму і навошта гэта трэба?

Што да трывожных навін пра Tesla, то іх некалькі. Першая — агенцтва Reuters паведаміла, што 90% аўто кампаніі выпускаюцца з дэфектамі, хоць у кампаніі гэта адмаўляюць. Другая — рэкордныя страты кампаніі за трэці квартал 2017-га — амаль 620 мільёнаў долараў, паведамляе Wall Street Journal. Трэцяя — зборка новага бюджэтнага аўтамабіля Model 3 значна адстае ад графіка, што дэманструе нестабільную бізнес-мадэль.

І фінальная дэталь. Замест таго каб вырашыць цяперашнія праблемы, Tesla паказала два новыя аўтамабілі — электрацягач і родстар. Калі кампанія здолее выбрацца з гэтай сітуацыі, то 2018 год зможа стаць прарыўным для ўсёй галіны, паколькі трэнд задае менавіта яна. Але падзе Tesla — можа спыніцца і галіна.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

■ Здарэнні

ЗГОН З ДАСТАЎКАЙ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама і Ленінскага РУУС сталіцы затрымалі 23-гадовага ўраджэнца Гомельскай вобласці, які падазраецца ў здзяйсненні чатырох крадзяжоў аўтамабіляў на тэрыторыі Ленінскага раёна.

Малады чалавек пражываў у мікрараёне Серабранка ў прыватным доме, працаваў у службе дастаўкі. У ліку ўкрадзеных ім аўтамабіляў Mercedes-Benz 250, два Volkswagen Jetta, Ford Sierra. Машыны ён выкрадаў з парковак каля жылых дамоў. Дзве прадаў, а з дзвюх другіх браў запчасткі для ўласнага аўтамабіля. Апошні факт згону быў у канцы лістапада, а пачаў сваю злачынную дзейнасць хлопец увесну. Аператыўнікам малады чалавек прызнаўся ў 11 крадзяжах з аўтамабіляў — акумулятараў, запчастак, камплектуючых. Заведзена крымінальная справа, зламысніку можа пагражаць да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. №401/С-31767 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский сад), площадью 1610,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422050400001000128 (назначение – для обслуживания здания детского сада), площадью 0,5434, расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0802 га
Начальная цена продажи	18 226,18 руб. (восемнадцать тысяч двести двадцать шесть рублей восемнадцать копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	911 руб. (девятьсот одиннадцать рублей)
Условия аукциона	Реконструкция и модернизация объекта
Продавец	ОАО «Скидельский сахарный комбинат», 231752, г. Скидель, ул. Первомайская, 1, 977-814
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	100% предварительная оплата
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 27 декабря 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 16.09.2017 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 декабря 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Уведомление

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 3 января 2018 года в 10.00 со следующей повесткой дня:

1. Принятие решения о крупной сделке. Подписание кредитного договора ОАО «Универсам Рига» с ОАО «Франсабанк».

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 50.

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 9.50 до 10.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678

Пад суд за хабар супрацоўніку ДАІ

На аўтадарозе Гомель — Урыцкае супрацоўнікі ДПС ДАІ спынілі аўтамабіль «Фольксваген», якім кіраваў 47-гадовы жыхар Гомельскага раёна. У яго адсутнічаў дакумент, які пацвярджае праходжанне дзяржаўнага тэхагляду.

Аказалася, за аналагічнае парушэнне кіроўца ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Таму, каб не патрапіць у рады «паўторнікаў» і пазбегнуць буйнога штрафу, ён прапанаваў міліцыянеру грошы. Афіцэр ДАІ адмовіўся, папярэдзіўшы аб супрацьзаконнасці такіх дзеянняў. Тым не менш мужчына паклаў некалькі купюр паміж сядзеннямі, што было зафіксавана відэарэгістратарам. На месца здарэння была выкліканая следча-аператыўная група, якая задакументавала злачынства. Падазраванага затрымалі, заведзена крымінальная справа, мужчына можа быць пакараны пазбаўленнем волі да пяці гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

алімпіец
ЗВЯЗДА ВЫПУСК №12 (61)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

«СПЫНІЎСЯ НА ТЭМАТЫЦЫ СЛУЦКІХ ПАЯСОЎ»

Біятланісты змянілі касцюмы, але чаму мы так і не ўбачылі іх галоўную «разыначку»?

У сёлетнім сезоне беларускія страляючыя лыжнікі паўсталі перад грамадскасцю ў нечаканых колерах — цяпер нашых спартсменаў на трасе можна ідэнтыфікаваць па камбінезонах васільковага колеру. Стваральнікам такіх касцюмаў выступіў беларускі дызайнер Віталь ОРЦЮХ, да гэтага яго работы — лагатыпы, знакі, фірмовыя стылі — можна было ўбачыць падчас чэмпіянату свету па футзале 2015, чэмпіянату Еўропы па канькабежным спорце 2016, на пластыкавых картках самага буйнога банка краіны і ў многіх іншых сферах (іх можна паглядзець на сайце дызайнера www.vitalika.by). Сёння ён расказвае, чаму абраў менавіта такі колер для формы нашых спартсменаў, што лягло ў аснову арнаменту, намаляванага на камбінезонах, і якія тэндэнцыі дыктуюць моду ў сучасным біятлоне.

У складзеным выглядзе форма змесціцца ў звычайным паштовым канверце

Віталь пачынае свой расказ пра вялікую справу, адзначаючы, што прапанову папрацаваць над стварэннем формы для нашых біятланістаў успрыняў, як велізарную ўдачу.

— Рэдка выпадае магчымасць зрабіць штосьці значнае для аднаго з маіх любімых відаў спорту. Кожны сезон сачу за гонкамі, адзначаю, якая форма, чаму мне падабаецца. Як, напэўна, кожны дызайнер, думаў: «Вось бы мне даручылі такую справу, я б зрабіў яшчэ лепш!» І вось у мінулым сезоне мне раптам паступіла такая прапанова. Было нечакана, але я ні імгнення не сумняваўся і ўзяўся за работу. Распрацаваў эскіз, ён спадабаўся, але аказалася, што форма для спартсменаў ужо пашытая, а мая задача толькі ў тым, каб размясціць на ёй лагатыпы спонсараў і неяк надаць нацыянальны каларыт. Зрэшты, мы пастараліся зрабіць усё магчымае і ў гэтай сітуацыі.

Эскізы і ідэі засталіся. Сёлета Віталю прапанавалі зрабіць форму ўжо з нуля. З боку федэрацыі было толькі адно пажаданне: яна не павінна быць абавязкова зялёнага або чырвонага колеру, пажадана выкарыстаць васільковы.

— Такое лаканічнае тэхзаданне мяне парадавала. Вопыт дызайну ў спартыўнай сферы ўжо быў. Вынік спадабаўся, ды і ўвесь працэс стварэння таксама. Сітуацыя з біятлоннай формай склалася па-іншаму. Пасля зацвярджэння праекта ён стаў жыць сваім жыццём, яго адаслалі ў выглядзе малюнка вытворцам у Маскву, а што з ім там адбывалася, я і не ведаў. Часам, з вялікімі прамежкамі, ад іх даходзілі рэдкія просьбы: выслаць арнамент у вектары, беларускі сцяг, апісанне колераў. Упершыню я ўбачыў форму, калі яна ўжо была гатовая і прыбыла ў Мінск літаральна за тыдзень да старту біятлоннага сезона.

Віталь не хавае, што першыя ўражанні ад яе выгляду засталіся неадназначныя.

— Першае, што мяне ўразіла, гэта яе памер: у складзеным выглядзе форма была нерэальна маленькая. Здаецца, яна магла б змясціцца ў звычайным паштовым канверце. Тканіна вельмі эластычная, тонкая, але ў той жа час досыць цёплая. Аднак гэта было адзінае прыемнае здзіўленне. На вытворчасці некаторыя элементы спрасцілі, а некаторыя і зусім выдалілі.

Выбар адзення на новы сезон — вялікая латарэя

Дызайнер адзначае, што заўсёды адсочваў тэндэнцыі ў сусветным біятлоне. У мінулым сезоне яму больш за астатняе падабалася адзенне французскіх біятланістаў.

— Яны выкарыстоўвалі такі дзіўны колер, нейкі прыглушаны, складаны сіне-зялёны, не яркі, але з першага погляду ён адрозніваўся ад усіх іншых. Многія спрабавалі вылучыцца, таму шылі яркую форму, а французы зрабілі ўсё вельмі стрымана і цэласна. Колер не меў дачынення да французскага сцяга, але адзін у адзін супадаў з колерам плашак з прозвішчамі біятланістаў, якія паказваюць унізе экрана падчас тэлевізійнай трансляцыі. Таму карцінка з французамі на экране выглядала гарманічна і эстэтычна. Дарэчы, сёлета яны выступаюць у той жа самай форме. Павінен адзначыць, што яшчэ некалькі зборных засталіся ў леташніх касцюмах: амерыканцы, палякі. Наогул, выбар формы на новы сезон — вялікая латарэя, бо ў якім адзенні будуць іншыя каманды, ніхто не ведае. Сёлета большасць каманд аказалася ў сіне-блакітным, мы ў іх ліку. Шчаслівы квіток выцягнулі шведы: іх роўна-жоўтыя камбінезоны нельга не заўважыць, а нашы ад іншых «сініх» адрозніваюцца светлымі каленямі і локцямі.

Ідэя з арнаментам была на паверхні, Віталь адзначае, што нават напружвацца не прыйшлося.

— Арнамент, вышыванка — гэта цяперашні трэнд. Але ж не хацелася проста выкарыстоўваць геаметрычны ўзор, падобны на арнамент са сцяга, гэта мне здавалася занадта ўжо прамалінейна. Хацелася чагосьці вытанчанага. Спыніўся на тэматыцы слуцкіх паясоў — нашага несумнеўнага культурнага багацця. Пачытаў, паглядзеў, вывучыў — і ўжыў іх прынцыпы і рэальныя ўзоры на форме. Арнаментальныя палосы змаляваў з пояса, які захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук. Мне спадабалася на гэтым поясе чаргаванне палос геаметрычнага і раслiннага арнаменту і прысутнасць у арнаменце васілька. Бо менавіта гэтая кветка, па вобразным выразе Максіма Багдановіча, стала тым элементам, які ператварыў першапачатковыя персідскія выразы ў наш нацыянальны здабытак. Васільковы колер, як я ўжо казаў, вызначыў старшыня Федэрацыі. І вельмі дарэчы. Мне прыйшла гэтая думка падчас прагляду індывідуальнай гонкі на першым этапе Кубка свету. Убачыў касцюм балгарскай зборнай, які, па ідэі, мог бы быць і нашым, калі б не ўстаноўка адысці ад колеру сцяга. А ўявіце, які быў бы канфуз, калі б беларусы і балгары выступалі ў аднолькавых камбінезонах...

Дызайнер расказвае, што наогул з'яўляецца прыхільнікам ідэі, каб прадстаўнікоў усіх відаў спорту адной краіны апранаць прыкладна ў аднолькавыя касцюмы.

— Гэта спросціць жыццё балельшчыкам. Бліжэй за ўсіх да гэтага падышлі італьянцы: іх спартсмены часцей за ўсё выступаюць у яркасінім. Скуадра Адзура — блакітная эскадра. Галандцы звычайна ў аранжавым у гонар каралеўскай дынастыі. Было б выдатна і нашай краіне заснаваць падобную традыцыю.

Думаў толькі аб адным, каб зрабіць адзенне, годнае нашых спартсменаў

Віталь кажа, што, ствараючы форму блакітнага колеру, не баяўся сутыкнуцца з крытыкай.

— Я турбаваўся толькі пра тое, каб нашы касцюмы не аказаліся падобнымі на шведскія. Але, на шчасце, шведы сваімі жоўтымі камбінезонамі знялі гэтыя пытанні. З нагоды крытыкі: сцішваю сябе прымаўкай: «У бясплоднае дрэва палкі не кідаюць». Даўно зразумеў: што б ты ні зрабіў — заўсёды будуць незадаволеныя. Думаў толькі аб адным: каб зрабіць форму так, як я яе сабе ўяўляю, каб зрабіць яе годнай нашых спартсменаў, каб выказаць у ёй усё сваё захапленне і павагу да іх. Хацелася, каб у нашых біятланістаў была не проста спартыўная форма, а натхнёная творчай энергіяй сіла продкаў і роднай зямлі.

Акрамя ўзораў са слуцкага пояса, на нашай форме выкарыстаны і ромбападобны арнамент, які нагадвае вышыўку крыжыкам.

— Ім афармлены каўнер і манжэты. Гэта зроблена ў традыцыях нашых продкаў, якія афармлялі такой вышыўкай краі адзення, каб пад яго не праніклі злыя духі. Спадзяюся, нашых спартсменаў гэта таксама захавае ад злога вока і іншых непрыемнасцяў.

Майстар кажа, што яшчэ ў працэсе стварэння формы быў гатовы да пытання пра тое, што на адзенні, якое носяць дзяўчаты, кветачкі — гэта добра, а вось на мужчынскай форме...

— Насіць слуцкія паясы мелі права толькі мужчыны. Больш за тое, жанчын не дапускалі нават да працэсу іх вытворчасці. Максім Багдановіч даў волю паэтычнай фантазіі, апяваючы слуцкіх ткачых, якіх на самай справе не было. Таму яшчэ вялікае пытанне, на кім гэтыя кветачкі больш дарэчныя.

Пры стварэнні камбінезона трэба ўлічыць галоўны момант — неабходна, каб біятлонная форма была перш за ўсё зручнай для саміх спартсменаў.

— Я адказваў толькі за знешняе афармленне, пра тэхналагічны бок клапаціліся вытворцы. Пры першым поглядзе на гатовую форму мяне здзівіла, што на локцях і верхняй частцы рукавоў няма спецыяльных пупырышак, якія памяншаюць слізгаценне. Звычайна яны робяцца празрыстымі і падобнымі на бурбалкі ва ўпаковачнай плёнцы. Калі падчас індывідуальнай гонкі Надзея Скардзіна заслужана часта трапляла на экран буйным планам, можна было бачыць, што на локцях яе касцюма па-над графікай нанесеныя цёмныя кропкі. Гэта значыць спартсменам прыйшлося дапрацоўваць форму самастойна? І яшчэ адна памылка выявілася падчас гонак. Калі мне перад пачаткам работы для прыкладу далі фатаграфіі нашай маладой біятланісткі ў форме, куртка ў яе была надзетая навыпуск. Я зыходзіў з таго, што так спартсмены яе і носяць. Менавіта на гэтай частцы курткі, якая павінна быць бачная з-пад камізэлькі з нумарам, і размяшчаўся галоўны элемент усяго касцюма, так званая «галава» слуцкага пояса з вялікім арнаментальным букетам. Меркавалася, што выглядаць гэта будзе так, як быццам з-пад камізэлькі сапраўды звісае край пояса. Гэта было галоўнай «разыначкай» майго праекта, але аказалася, што ніхто з спартсменаў не носіць куртку навыпуск. Такім чынам, атрымалася, што самая прыгожая, самая каштоўная частка афармлення касцюма засталася схаванай пад камізэлькай і штанамі. І гэта прыгажосць засталася ўнутраным зместам нашых спартсменаў, іх асабістым багаццем, якое не выстаўляецца напаказ.

Заўсёды сустракаю і развітваюся са сваёй зімой не па календары, а па біятлонным сезоне. Мая зіма звычайна доўжыцца ад Эстэрсунда да Ханты-Мансійска (у гэтым сезоне — да Цюмені). А яшчэ, біятлон — гэта вельмі прыгожа! Ён мне нагадвае адну рэч — маляўнічы, яркі і вясёлы калейдаскоп. Яго можна павольна паварочваць, і тады малюнак паступова мяняецца. А калі страсянуць — мяняецца да непазнавальнасці. Так і ў біятлоне: падчас бегу сітуацыя мяняецца павольна і паступова, а пасля стральбы — можа змяніцца да непазнавальнасці. І васільковыя касцюмы са светлымі каленямі апынуцца раптам далёка наперадзе ўсіх астатніх, шэра-бура-малінавых!

■ Экспрэс-навіны

РОБАТ ПРЫНЯЎ УДЗЕЛ У ЭСТАФЕЦЕ АЛІМПІЙСКАГА АГНЮ

Гэта адбылося ў паўднёвакарэйскім горадзе Тэджон

Незвычайнага факеланосца стварылі інжынеры Карэйскага інстытута перадавых тэхналогій, па тэрыторыі якога робат і пранёс Алімпійскі агонь. Атрымаўшы факел, HUBO праехаў з ім каля 100 м да кардоннай сцяны. З дапамогай невялікай пілы ён прарэзаў у ёй дзірку, праз якую перадаў агонь свайму стваральніку — прафесару О Чун-хо.

Між тым перад HUBO агонь неслі адзін з заснавальнікаў Лабараторыі робататэхнікі і механікі Каліфарнійскага ўніверсітэта Лос-Анджэлеса прафесар Дэніс Хонг і робат KAIST — кіраваная чалавекам мадэль FX-2. Менавіта ў Каліфорніі робат HUBO стаў пераможцам конкурсу DARPA Robotics Challenge 2015 года.

Адзначаецца, што робаты HUBO працягнуць працаваць на Алімпіядзе. Яны будуць сустракаць гасцей спаборніцтваў у аэрапорце і падтрымліваць удзельнікаў на стадыёнах. Таксама ў робатаў можна будзе атрымаць даведачную інфармацыю на англійскай, кітайскай, карэйскай і японскай мовах.

АЛІМПІЙЦЫ НАДЗЕНУЦЬ ШАПКІ АД «ПАЛЕССЯ»

Адкрытае акцыянернае таварыства «Прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе» прыступіла да вырабу цёплых рэчаў для дэлегацыі Беларусі, якая прыме ўдзел у Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане.

Паведамляецца, што паступіў заказ на выраб 130 камплектаў шапак, шалікаў і пальчатак, якія дапоўняць экіпіроўку спартсменаў, трэнераў і іншых прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі на Алімпіядзе. Яшчэ 100 камплектаў будзе выпушчана для ўдзельнікаў Параалімпіяды-2018. Таксама на «Палессе» паступіла заяўка на выпуск каля 2 тысяч «алімпійскіх» вырабаў для адпраўкі ў гандлёвыя сеткі краіны.

Цёплыя рэчы звязаныя з ПАН-пражы, якая па ўласцівасцях максімальна набліжана да паўшарсцяных. Асноўныя колеры вырабаў — шэры і чырвоны. Акцэнт зроблены на малюнак сняжынкі, якая выканана ў стылістыцы нацыянальнага арнаменту. Яшчэ адным напамінам алімпійцам аб культурным здабытку краіны будзе шалік, зроблены накшталт традыцыйнага беларускага пояса.

КАЛІ СПОРТ ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў ІНСТРУМЕНТ ПАЛІТЫКІ...

Або быў такі заўсёды?

На мінулым тыдні ў інфармацыйныя стужкі сусветных сродкаў масавай інфармацыі ўварвалася гучная навіна — Расія адхілена ад удзелу ў зімовых Алімпійскіх гульнях 2018 года. Алімпійскі камітэт гэтай краіны пакараны з-за масавых парушэнняў антыдопінгавых правілаў, але «чыстыя» спартсмены ўсё ж такі змогуць выступіць на Гульнях, праўда, толькі пад нейтральным сцягам. Грамадскасць захліснула маса меркаванняў, заяў, здагадак, шуміха не заканчваецца і сёння.

У гісторыі алімпійскага руху такое здарылася ўпершыню (каб краіну адхілілі з-за допінгу), хоць усе ведаюць, што выпадкі, калі адразу цэлыя дзяржавы не ўдзельнічалі ў самых маштабных спартыўных спаборніцтвах свету, ужо бывалі, праўда, прычыны таму часцей за ўсё насілі палітычны характар. Сёння ўспамінаем самыя яркія і маштабныя байкоты і скандалы ў гісторыі алімпійскага руху.

* * *

Публічная дэманстрацыя палітычнага пратэсту была ўласціва Алімпійскім гульням фактычна першапачаткова. А вось першы свядома арганізаваны байкот па ініцыятыве Міжнароднага алімпійскага камітэта адбыўся напярэдадні **Алімпіяды ў Антверпене ў 1920 годзе.** Па афіцыйна абвешчаных палітычных матывах — у якасці пакарання за развязванне Першай сусветнай вайны — на Алімпіяду не былі запрошаныя спартсмены Германіі і яе краін-саюзніц. Не было ў Антверпене і спартсменаў з Савецкай Расіі — МАК, несумненна, па палітычных прычынах, не задаволіў заяўку Усевобуча (усеагульнае ваеннае навучанне) аб допуску дэлегацыі на Гульні.

У ходзе падрыхтоўкі да наступных **Алімпійскіх гульняў у Парыжы ў студзені 1924 года** пры пасрэдніцтве Французскага працоўнага спартыўна-гімнастычнага саюза аргкамітэт парыжскай Алімпіяды перадаў у Вышэйшы савет па фізічнай культуры РСФСР афіцыйнае запрашэнне СССР на Гульні. Аднак гэтым разам адмова паступіла ўжо з расійскага боку: РСФСР палічыла непрымальнай падобную — праз пасрэдніка — форму адносін з алімпійскім рухам. Аналагічныя беспаспяховыя спробы прыцягнення савецкіх спартсменаў да ўдзелу ў алімпійскім руху рабіліся з боку некаторых НАКаў і іншых спартыўных арганізацый і пазней — напярэдадні X Алімпіяды ў Лос-Анджэлесе і Гульняў 1940 года, якія не адбыліся з-за вайны. У выніку савецкі спорт быў прадстаўлены толькі на XV Алімпійскіх гульнях 1952 года ў Хельсінкі.

Томі Сміт і Джон Карлас на п'едэстале гонару пратэстуюць супраць расізму ў ЗША. 1968 год.

* * *

Алімпійскія гульні ў Мехіка 1968 года запомніліся студэнцкімі байкотамі. За дзесяць дзён да старту на плошчу Трох Культур выйшлі 15 тысяч чалавек. Асноўным лозунгам дэманстрантаў быў «Мы не хочам Алімпіяды, мы хочам рэвалюцыі!» Улады ўвялі ў сталіцу войскі, правялі масавыя арышты і ўжылі празмерную сілу для разгону натоўпу. Ніякіх санкцый з боку МАК не было, арганізацыя заявіла, што ўсё тое, што адбылося — унутраная справа Мексікі.

Таксама Гульні ў Мехіка адзначыліся байкотамі асобных спартсменаў.

* * *

Мюнхенская Алімпіяда 1972 года працягнула сумную эстафету байкотаў: тады на цырымонію ўзнагароджання дэманстратыўна не выйшла зборная ЗША па баскетболе, якая прайграла фінал зборнай СССР. Пасля гульні амерыканская зборная падала афіцыйны пратэст на дзеянні суддзяў (а менавіта: на даданне трох секундаў пасля паўторнага запуску табло, у якія, дарэчы, беларус Іван Ядэшка прынёс «золата» Савецкаму Саюзу).

Цырымонія ўзнагароджання тройчы адкладалася, у выніку каманда СССР атрымала медалі праз суткі пасля матча ў гандбольнай зале і без балельшчыкаў. Сярэбраныя ўзнагароды ЗША цяпер захоўваюцца ў адным з банкаў (па іншых звестках, у галоўным офісе МАК) у Лазане. А капітан баскетбольнай зборнай ЗША Кені Дэвіс нават напісаў у завяшчанні, каб ніхто з нашчадкаў ніколі не згаджаўся на атрыманне гэтага яго медаля.

Акрамя таго, у Мюнхене быў здзейснены тэрарыстычны акт супраць зборнай Ізраіля. Пасля гэтага частка СМІ і грамадскасці стала патрабаваць спыніць Алімпіяду ў знак жалобы па ахвярах тэракта, але МАК прыняў рашэнне, што спыненне Гульняў будзе азначаць перамогу тэрарыстаў і знакам, што ім удалося сарваць Гульні. Таму было вырашана абмежавацца толькі правядзеннем жалобнай цырымоніі ў алімпійскай вёсцы і памінальнай службай на галоўным стадыёне, а ўжо на наступны дзень Алімпійскія гульні працягнуліся.

Сярод 122 сцягоў краін-удзельніц на стадыёне быў прыспушчаны толькі сцяг Ізраіля, а самі ізраільскія алімпійцы, не робячы ніякіх гучных заяў, ноччу пакінулі Германію і вярнуліся дадому. Гульні таксама пакінулі некаторыя спартсмены з Алжыра, Нідэрландаў, Філіпін і ЗША.

* * *

На 80-я гады XX стагоддзя прыйшоўся пік палітычнага супрацьстаяння ў ходзе халоднай вайны, што не проста адбілася на **Алімпіядзе ў Маскве і Лос-Анджэлесе,** гэтыя Гульні адзначыліся самымі гучнымі і шматлікімі байкотамі за ўсю гісторыю алімпійскага руху.

Ідэя байкоту ў знак пратэсту супраць уводу савецкіх войскаў у Афганістан у снежні 1979 года нарадзілася на сустрэчы НАТА. Пазней прэзідэнт ЗША Джымі Картэр выказаўся за прыпыненне сувязяў з СССР і прапанаваў МАК перанесці Алімпіяду ў іншую краіну. МАК адхіліў гэтую ідэю. Дачакаўшыся нармальнага завяршэння гульняў зімовай Алімпіяды ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе, Джымі Картэр выставіў Савецкаму Саюзу ўльтыматум: калі савецкая армія да 20 лютага не пакіне Афганістан, ЗША будуць байкатаваць маючыя адбыцца ў Маскве летнія Гульні. Як вядома, ультыматум быў праігнараваны.

Увогуле маскоўскую Алімпіяду-80 у той ці іншай форме байкатавалі спартсмены з 64 дзяржаў, праўда, пэўная іх частка з эканамічных, а не палітычных прычын, а, напрыклад, Іран, Мазамбік і Катар проста не былі запрошаныя МАК. Урады Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Іспаніі дазволілі сваім Алімпійскім камітэтам самастойна прымаць рашэнні аб удзеле ў Алімпіядзе. У выніку большасць спартсменаў са згаданых краін на Гульні ўсё ж такі прыехалі ў індывідуальным парадку.

На цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпіяды 16 зборных ішлі не пад нацыянальнымі сцягамі, а пад алімпійскім. Пры ўручэнні медалёў атлетам з гэтых краін гучалі не нацыянальныя гімны, а алімпійскі гімн.

* * *

Летнія Алімпійскія гульні 1984 года ў Лос-Анджэлесе байкатаваліся ўсімі краінамі сацыялістычнага лагера (акрамя Румыніі, Югаславіі і КНР). Афіцыйнай прычынай стала адмова арганізатараў Алімпіяды-84 даць гарантыі бяспекі спартсменам з СССР і іншых краін Варшаўскага пагаднення.

Тагачасны прэзідэнт МАК Хуан Антоніа Самаранч актыўна спрабаваў пераканаць савецкае кіраўніцтва змяніць сваё рашэнне, але не дасягнуў поспеху.

Адначасова з паведамленнем аб рашэнні СССР байкатаваць Гульні было абвешчана аб правядзенні ў дзевяці краінах сацблока міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84». Спаборніцтвы праводзіліся па ўсіх алімпійскіх відах спорту, акрамя футбола і сінхроннага плавання, а таксама па трох неалімпійскіх відах — самба, тэнісе і настольным тэнісе. У «Дружбе-84» прынялі ўдзел спартсмены больш чым з 50 краін, як тыя, хто байкатаваў Гульні ў Лос-Анджэлесе, так і тыя, хто не выступаў з пратэстам. На турніры было ўсталявана некалькі дзясяткаў сусветных рэкордаў.

У выніку двух узаемных байкотаў Алімпійскіх гульняў з боку СССР і ЗША тагачасным прэзідэнтам МАК Самаранчам былі ўнесены дадатковыя артыкулы аб сур'ёзных санкцыях у дачыненні да НАК краіны, якая паспрабуе выступіць з байкотам. Такі ўчынак можа пагражаць дыскваліфікацыяй адпаведнай зборнай на адну або некалькі будучых Алімпіяд.

* * *

У Алімпіядзе 2000 года ў Сіднеі прынялі ўдзел усе члены МАК — за выключэннем Афганістана, які байкатаваў Гульні. Тэакратычны рэжым Талібану забараніў спорт увогуле, ліквідаваў НАК краіны і адхіліў запрашэнне МАК. Прысутнасць спартсменаў-афганцаў стала немагчымая.

❍ Да тэмы

Пад нейтральным сцягам звычайна разумеюць алімпійскі сцяг, які ўпершыню быў узняты на Алімпіядзе-1924 у Антверпене. Сёння ўдзел спартсменаў пад сцягам МАК практыкуецца ў двух выпадках: калі краіна знаходзіцца ў працэсе станаўлення або калі НАК краіны часова выключаны са складу МАК за тыя ці іншыя парушэнні. Па першай прычыне ў Сіднеі-2000 выступілі нейтральныя спартсмены з Усходняга Тымора, у Лондане-2012 — з Паўднёвага Судана і Нідэрландскіх Антыльскіх астравоў. Другая прычына ў розныя гады замінала апрануцца ў нацыянальныя колеры алімпійцам з Кувейта, Эквадора, Індыі і Шры-Ланкі. А на Алімпіядзе-2016 у Рыа-дэ-Жанэйра выступіла асобная зборная бежанцаў — таксама пад алімпійскім сцягам.

■ Еўрагульні. Арэны

ЗА 50 ГАДОЎ ЁН БАЧЫЎ УСЁ

Мінскі палац спорту: якім быў у 1966-м і якім будзе ў 2019-м

Напэўна гэта самы вядомы спартыўны будынак сталіцы, яго ведаюць як дарослыя аматары спорту, так і юныя. На ім запальваліся «зоркі» 50 гадоў таму і запальваюцца сёння. Ён прымаў спаборніцтвы рознага ўзроўню — ад спартакіяд да чэмпіянатаў свету, быў запатрабаваны палову стагоддзя таму, калі з'яўляўся самым буйным спартыўным аб'ектам сталіцы і застаецца папулярны сёння, калі ўжо даўно не з'яўляецца самым маштабным у Мінску.

Будаўніцтва арэны пачалося ў 1963-м, у адным з самых жывапісных месцаў сталіцы — на беразе Свіслачы, а завяршылася праз тры гады, напярэдадні Дня Перамогі 7 мая 1966-га. Збудаванне па тых часах стала ўнікальным і першым такім у Савецкім Саюзе. Пры яго стварэнні былі ўжытыя новыя будаўнічыя матэрыялы і зроблены арыгінальныя сядзенні з шклапластыку. Пазней дакладна такія ж спартыўныя палацы з'явіліся ў Чэлябінску, Днепрапятроўску, Валгаградзе і Вільнюсе.

Папулярнасцю арэна стала карыстацца адразу, за першыя 20 гадоў у мінскім Палацы спорту адбыліся найбуйнейшыя рэспубліканскія спаборніцтвы, саюзныя чэмпіянаты і міжнародныя турніры па барацьбе, фехтаванні, боксе, цяжкай атлетыцы, спартыўнай і мастацкай гімнастыцы. Тут праводзілі свае матчы ў саюзных чэмпіянатах хакейны клуб «Дынама» і гандбольны СКА.

За 50 гадоў на гэтай арэне запалілася далёка не адна сусветная спартыўная «зорка». Напрыклад, у пачатку 70-х на чэмпіянаце Еўропы па спартыўнай гімнастыцы, які праходзіў у Мінску, бліскала наша Тамара Лазаковіч. Вольга Корбут, дарэчы, тады таксама была ў Мінску, але толькі ў якасці запасной у камандзе СССР. На юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па хакеі на лёдзе мінскага Палаца спорту гуляў сённяшні галоўны трэнер зборнай Расіі па хакеі, а тады яшчэ юны Алег Знарок. З юніёрскага хакея тут пачыналася кар'ера такіх зорак, як Яўгена Малкіна і Аляксандра Радулава.

Акрамя спартыўных мерапрыемстваў у Палацы праводзіліся і праводзяцца канцэрты, выстаўкі і іншыя культурна-масавыя мерапрыемствы. У яго сценах пабывалі такія вядомыя прадстаўнікі шоу-бізнесу, як Энрыке Іглесіяс, Ванэса Мэй, Наталля Арэйра, Ала Пугачова і іншыя.

Не дзіўна, што на пачатку 2000-х Палац ужо меў патрэбу ў абнаўленні, таму была праведзена паэтапная рэканструкцыя: абноўленыя фасады будынка, заменены халадзільнае, светлавое і гукавое абсталяванні, усталявана сістэма кандыцыянавання паветра, заменены сядзенні для гледачоў, устаноўлена новае электронна-інфармацыйнае табло.

Сёння ў гэтым шматфункцыянальным комплексе могуць праходзіць спаборніцтвы па 22 відах спорту, а таксама канцэрты і іншыя відовішчныя мерапрыемствы.

На фоне буйных сучасных спартыўных збудаванняў 50-гадовы Палац спорту не згубіўся, пра гэта сведчыць яго запатрабаванасць. За першыя дзевяць месяцаў гэтага года комплекс прыняў 20 спартыўных турніраў рознага ўзроўню. У іх ліку чэмпіянат свету па тайскім боксе і паўэрліфтынгу,

Кубак Еўропы па дзюдо, этап Кубка свету па скачках на батуце. Дзякуючы сваёй шматфункцыянальнасці перыядычна на працягу года ён ператвараўся ў лядовую пляцоўку, дзе праходзілі матчы чэмпіянату краіны па хакеі.

Таму не дзіўна, што аб'ект увайшоў у спіс палацаў, якія прымуць спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў. Плануецца, што тут пройдуць турніры па самба, грэка-рымскай, вольнай і жаночай барацьбе.

Чакаецца, што да Еўрагульняў Палац спорту яшчэ трохі зменіцца ў лепшы бок, хоць капітальны рамонт праводзіцца там штогод, а сур'ёзных паломак наогул ніколі не было. Да 2019 года плануецца закупіць табло памерам 12,5 м на 7 м, якое будзе складацца з чатырох частак. На ім будуць паказваць паўторы спаборніцтваў і рэкламу (цяпер у Палацы спорту ўжо ёсць адно мультымедыйнае гульнявое табло), таксама ў планах набыць гукавы пульт, які зробіць спаборніцтвы яшчэ больш яркімі, гучнымі і зручнымі для гледачоў

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0» **с 19 января 2018 года**

Сумма депозита, ед. валюты		% годовых			
		Сроки			
		до 6 месяцев 90 – 180 дней	**от 6 месяцев до 1 года** 181 – 370 дней	**от 1 года до 2 лет** 371 – 740 дней	**от 2 до 5 лет** 741 – 2 000 дней
Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных до 01.04.2016 года*					
1 – 1 000		**9,5**	**9,5**	**9,5**	**9,5**
1 001 – 5 000		**9,5**	**9,5**	**9,5**	**9,5**
5 001 и более		**9,5**	**9,5**	**9,5**	**9,5**
Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, в долларах США, евро и российских рублях **					
1 – 1 000		**0,1**	**0,1**	**0,1**	**0,1**
1 001 – 5 000		**0,1**	**0,1**	**0,1**	**0,1**
5 001 и более		**0,1**	**0,1**	**0,1**	**0,1**
Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в долларах США и евро, заключенных до 01.04.2016 *					
1 – 500		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
501 – 5 000		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
5 001 и более		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
Для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0 в российских рублях, заключенных до 01.04.2016 *					
1 – 15 000		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**
15 001 – 150 000		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**
150 001 и более		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**

Настоящие ставки применяются:

* для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0», за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий договора срочного банковского вклада (депозита) Система сбережений Линия роста 2.0» (далее – Условия);

** для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в случаях автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.7 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136 Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни. Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017
выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» **с 19 января 2018 года**

Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками

Сумма депозита, ед. валюты		% годовых						
		Срок, дни						
		100	200	300	500	1 000	2 000	3 000
Белорусские рубли *								
1 – 100		9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50
101 – 1 000		9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50
1 001 и более		9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50	9,50
Доллары США, Евро *								
1 – 500		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
501 – 5 000		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
5 001 и более		**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**	**2,5**
Российские рубли *								
1 – 15 000		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**
15 001 – 150 000		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**
150 001 и более		**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**	**5,5**
Белорусские рубли, Доллары США, Евро, российские рубли **								
1 – 500		0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10
501 – 5 000		0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10
5 001 и более		0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10	0,10

Настоящие ставки применяются:

* для договоров срочного банковского вклада (депозита) с переменными процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, за исключением случаев автоматического увеличения срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» (с переменной процентной ставкой), утвержденных решением Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 16.02.2006, протокол №21 (далее – Условия);

** для договоров срочного банковского вклада (депозита) с переменными процентными ставками, заключенных до 01.09.2013, в случаях автоматического увеличения с 01.04.2016 срока их хранения в соответствии с пунктом 3.6 Условий.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136 Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни. Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017
выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГВТУП «БЕЛСПЕЦВНЕШТЕХНИКА»

